КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №43 (127)
◂ 12 СНЕЖНЯ ◂ 2008 г.

# Новы Час



**ПАТРЫЁТЫ ПАЭЗІІ**

Стар. 15

**ІП СТРАЙКУЮЦЬ І РЫХТУЮЦЦА ДА МІТЫНГАЎ**

Вынікі года індывідуальныя прадпрымальнікі падводзяць акцыямі пратэсту. У сераду, 10 снежня, па дадзеных арганізатараў страйку, не працавалі каля 40 працэнтаў індывідуальных прадпрымальнікаў.

Стар. 4

**АПОШНІ ЧЫРВОНЫ ЛІХТАР У КВАРТАЛЕ**

У рамках гарадской рэформы ўлады Амстэрдама вырашылі знішчыць легендарны раён чырвоных ліхтароў.

Стар. 11

**Я НАРАДЗІЎСЯ ТУТ…**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ**

**«БУНТОЎНА»**

Літаратурны партрэт грамадскай актывісткі Тацццяны Ялавай у выкананні Марыі Мартысевіч

З серыі «Новая генерацыя»

СУД

# НЕ ПЫТАЙСЯ, ПА КІМ ЗВОНІЦЬ ЗВОН…

Вольга ХВОІН

**11 снежня ў Мінску скончыўся судовы працэс над Аляксандрам Баразенкам па «справе чатырнаццаці», заведзенай на моладзевых актывістаў за ўдзел у зімовых акцыях пратэсту прадпрымальнікаў. Суддзя Вайцяховіч прызнала Аляксандра Баразенку вінаватым у парушэнні арт. 341–1 Крымінальнага кодэкса Беларусі і прызначыла пакаранне — адзін год абмежавання волі без накіравання ў спецустановы. Ад 27 кастрычніка Аляксандр знаходзіўся ў следчым ізалятары, пасля таго, як прысуд быў зачытаны, яго вызвалілі ў зале суда. Аляксандра віталі воплескамі, родныя сустракалі хлопца са слязамі на вачах.**



Сёлета ў красавіку па «справе чатырнаццаці» ўжо былі асуджаныя 13 маладых людзей, якія прымалі ўдзел у акцыях пратэсту прадпрымальнікаў. Тады судом былі прызначаны пакаранні ў выглядзе штрафаў, абмежавання волі без накіравання ў спецустановы тэрмінам на паўтара і два гады, Андрэй Кім быў таксама абвінавачаны ў злачынстве, прадугледжаным артыкулам 364 Крымінальнага кодэкса (насілле або пагроза насілля ў дачыненні да супрацоўніка міліцыі). Суддзя Алена Ільіна прыгаварыла Кіма да пазбаўлення волі тэрмінам на паўтара года з адбываннем пакарання ў калоніі агульнага рэжыму. Аляксандра Баразенкі на працэсе ў красавіку не было — ён навучаўся ў Польшчы ва Вроцлаўскім універсітэце. У кастрычніку Аляксандр разам са сваім адвакатам Паўлам Сапелкам прыйшоў у пракуратуру да следчага, дзе яго і арыштавалі.

Судовы працэс над Баразенкам быў надзвычай хуткі. Праўда, патрапіць на яго змаглі не ўсе: судовую залю запоўнялі студэнтамі сталічных ВНУ. На пачатку працэсу Аляксандр Баразенка заявіў, што не давярае суду, які баіцца галоснасці і напаўняе залю невядомымі людзьмі, але законных падстаў для адводу суддзі не мае. Пасля Аляксандр папрасіў суд дазволіць яму сядзець на працэсе побач з адвакатам, а не ў клетцы, суд хадайніцтва адхіліў. На гэта юнак заявіў: «Каб забяспечыць роўнасць бакоў, прашу пасадзіць дзяржаўнага абвінаваўцу ў такую ж клетку». Даваць паказанні на судзе Аляксандр адмовіўся.

Цягам двух дзён былі апытаныя сведкі, вывучаныя пісьмовыя і відэаматэрыялы справы. Цікава, што калі на красавіцкім працэсе сведкі з боку міліцыі пазнавалі абвінавачваемых у якасці парушальнікаў, то Аляксандра Баразенку ніхто не пазнаў, ніхто не патрабаваў ад юнака кампенсацыі за якія-кольвек грашовыя ці маральныя страты. Было бачна, што ніякіх доказаў віны Аляксандра няма. Фактычна да такой жа адказнасці можна было прыцягнуць любога чалавека, які ўдзельнічаў у мітынгу. Між іншым, артыкул 35 Канстытуцыі гарантуе грамадзянам Беларусі свабоду сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і пікетавання.

У апошнім слове Аляксандр Баразенка заўважыў, што яшчэ два гады таму і не думаў, што апынецца на лаве падсудных. «Тады я быў паспяховым студэнтам БДУ, але атмасфера страху і глупства ў краіне прымусіла мяне заняцца грамадскай дзейнасцю. Наша ўлада не любіць актыўных і разумных, а ўкладае грошы ў дэгенератаў. Я зведаў правакацыі, затрыманні, турму — і як вынік — суд». Баразенка папрасіў прабачэння ў іншых удзельнікаў «працэсу чатырнаццаці» за тое, што не быў з імі, а з'ехаў у Польшчу. Пасля заявіў, што і надалей збіраецца змагацца за перамены ў краіне. Таксама моладзевы актывіст звярнуў увагу на тое, што працэс над ім адбываецца на фоне паляпшэння стасункаў з Захадам, што мусіць быць сігналам для чыноўнікаў Еўрасаюзу. «Няма чалавека, які быў бы як выспа, сам па сабе, кожны чалавек ёсць частка мацерыка, частка сушы... Таму ніколі не пытайся, па кім звоніць звон: ён звоніць па табе», — Аляксандр скончыў сваю прамову цытатай з Эрнэста Хэмінгуэя.

Абвінаваўчы прысуд не стаўся нечаканым. Калі б Баразенку апраўдалі, то гэта фактычна азначала б, што і іншых удзельнікаў «працэсу чатырнаццаці» варта апраўдаць ці прынамсі перагледзець іх справы, бо абвінаваўчая база была прыблізна аднолькавай.

На судзе цягам двух дзён прысутнічалі не толькі родныя і сябры Аляксандра Баразенкі, але і палітыкі. Былы палітвязень Аляксандр Казулін лічыць, што падобныя працэсы — вынік арганізацыі дзяржаўнага ладу. «Гэта нашае жыццё, такое, якое ёсць. Сама дзяржава правакуе людзей на падобныя акцыі пратэсту. Звычайна, калі нешта не задавальняе грамадзян, то дзяржава рэагуе на гэта і імкнецца так ці інакш з імі дамовіцца. У нас цяпер напаўфеадальнае грамадства, так што нічога дзіўнага ў падобных узаемаадносінах дзяржавы і грамадства няма», — адзначыў палітык. Кіраўнік руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч лічыць, што прысуд ёсць злачынным, бо фактычна не было доказаў віны. «На тле перамоў з Захадам улады імкнуцца паказаць, што яны з'яўляюцца гаспадарамі. Нягледзячы ні на што ўлада не ў стане зрабіць рашучы крок у накірунку выканання правоў чалавека. Мы на ўсіх сустрэчах патрабуем, каб менавіта чалавек быў на першым плане, усё астатняе другасна», — падкрэсліў Аляксандр Мілінкевіч.

Адзін з фігурантаў «справы чатырнаццаці» Міхаіл Пашкевіч лічыць, што гэты прысуд не апошні ў ланцугу палітычных: «У любы момант ад цяперашняга рэжыму можна чакаць новых крымінальных спраў на людзей, якія цяпер знаходзяцца па-за межамі краіны. Пытанне толькі ў часе».

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### КЛЕЦК

**У Клецку створана пярвічная арганізацыя Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.**

Як паведаміў старшыня таварыства Антон Астаповіч, на 7 снежня планавалася сустрэча кіраўніцтва арганізацыі з жыхарамі горада. «Неабходнасць такой сустрэчы дыктавалася праблемамі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны на тэрыторыі Клецкага раёна ў сувязі з самавольнай зменай знешняга выгляду помніка архітэктуры сталага барока XVII стагоддзя — былога Благавешчанскага касцёла даміініканцаў у Клецку і разбурэннем свірна ў вёсцы Яновічы Клецкага раёна — помніка архітэктуры пачатку XIX стагоддзя», — зазначыў А. Астаповіч.

Паводле яго слоў, ініцыятарам сустрэчы выступіла грамадскасць Клецка. Мясцовы жыхар Сяргей Панамароў накіраваў у райвыканкам заяўку з просьбай дазволіць правядзенне такога мерапрыемства. Ён атрымаў афіцыйны адказ, што на правядзенне сустрэчы пісьмовага дазволу ўладаў не патрабуецца.

Апрача таго, паведаміў А. Астаповіч, у канцы лістапада ў тэлефоннай размове з ім начальнік аддзела культуры райвыканкама Пётр Дудук абяцаў узяць удзел у такой сустрэчы.

Аднак непасрэдна ў дзень мерапрыемства прадстаўнікі ўлады, у тым ліку супрацоўнікі міліцыі, не дазволілі праводзіць сустрэчу ў будынку раённага Дома культуры, дзе яна планавалася. Прысутным давялося ісці ў дзіцячае кафэ.

Нягледзячы на ўсе перашкоды, сустрэча адбылася. На ёй створана пярвічная гарадская арганізацыя Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. А. Астаповіч выказаў надзею на тое, што з часам тэрытарыяльная структура таварыства будзе створана ў Клецкім раёне.

### ГРОДНА



**Гродзенскія краязнаўцы і журналісты выпусцілі альманах «Позірк з Новага Свету». Ён прысвечаны старому гарадскому кварталу, які носіць назву Новы Свет. Квартал размяшчаецца побач з гістарычнай забудовай Гродна, аднак не ўваходзіць у ахоўную зону.**

У альманаху сабраны фатаграфіі, успаміны гараджан, і нават змешчаны комікс на тэму з'яўлення гэтага раёна, што забудоўваўся з канца XIX стагоддзя. Прэзентацыя альманаха і паказ аматарскага фільма «Гродна. Новы Свет» адбыліся 7 снежня ў кватэры аднаго з жыхароў квартала.

Як зазначыла кіраўнік праекта Хрысціна Марчук, гэта быў першы вопыт цесных зносінаў непасрэдна з жыхарамі Новага Свету, забудову якога мясцовыя ўлады маюць намер «прарэдзіць», пакінуўшы толькі самыя моцныя будынкі.

«Мы рады, што знайшлі агульную мову з людзьмі, якія жывуць у Новым Свеце, — падкрэсліла Х. Марчук. — На прэзентацыю сабраліся людзі, якія любяць гэта месца і хочуць, каб стары квартал захаваўся. Яны кажуць, што жывуць у няпэўнасці, не ведаючы дакладна, якія дамы будуць зносіць і калі. Жыхарам нельга рабіць прыбудовы, няма сэнсу рабіць вялікі рамонт, укладаць грошы». Разам з тым, зазначыла кіраўнік праекта, гэтыя людзі не жадаюць пакідаць свой квартал.

### НАВАГРУДАК

**У наступным годзе ў гістарычным цэнтры Навагрудка (Гродзенская вобласць) плануецца паставіць конны помнік заснавальніку і першаму вялікаму князю Вялікага княства Літоўскага Міндоўгу, паведаміў галоўны спецыяліст аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама Вячаслаў Лаўрашчук.**

Паводле яго слоў, у 2009 годзе будзе адзначацца 1000-годдзе першага ўзгадвання Літвы ў летапісах і 965-годдзе Навагрудка — першай сталіцы ВКЛ. Над праектам статуі працуе мінскі скульптар Генадзь Буралкін. Ён прапануе адліць з бронзы коннага Міндоўга з мячом і ўстанавіць гэтую кампазіцыю на каменным пастаменце.

«Разам з тым дакладнае месца ўзвядзення помніка пакуль не вызначана, як і дата яго адкрыцця», — сказаў В. Лаўрашчук. Паводле яго слоў, ураджэнец Навагрудка Павел Касцюкевіч стварыў у Маскве Нацыянальны інвестыцыйны фонд Беларусі («Навагрудак») для збору сродкаў і аказання фінансавай дапамогі ў рэалізацыі гэтага і іншых праектаў, накіраваных на аднаўленне гісторыка-культурнай спадчыны горада і ўшанаванне памяці дзеячаў айчыннай гісторыі, навукі і культуры, чыё жыццё звязана з Навагрудкам.

«Кіраўніцтва горада падтрымлівае праект узвядзення помніка, аб чым сведчаць публікацыі гэтага года ў рэспубліканскіх выданнях «Голас Радзімы» (дадатак да газеты «Советская Белоруссия») ад 31 ліпеня і «Звязда» ад 6 жніўня, падрыхтаваных вядомымі беларускімі вучонымі Міхаілам Касцюком, Вячаславам Чамярыцкім і Адамам Мальдзісам», — зазначыў В. Лаўрашчук.

**Паводле БелаПАН**

СМІ

## ЗА РАСПАЎСЮД «НОВАГА ЧАСУ» — ПРАТАКОЛ

**Язэп ПАЛУБЯТКА**

**За распаўсюд газеты «Новы час» у Астравецкім райвыканкаме затрымалі і склалі пратакол на Івана Крука — вядомага дэмакратычнага актывіста, аднаго з арганізатараў супраціву пабудове АЭС на Астравеччыне.**

Асобнікі газеты «Новы час», дзе быў змешчаны артыкул пра экалагічныя наступствы пабудовы атамнай станцыі, Іван Крук прынёс у райвыканкам, каб азнаёміць супрацоўнікаў, якія на працягу паўгода агітавалі насельніцтва ў падтрымку пабудовы АЭС. Пра акцыю Івана Крука «дабразычліўцы» даклалі кіраўніку спраў райвыканкама Міхаілу Зімніцкаму. Адзін з асобнікаў той забраў сабе, але пры гэтым склаў на Івана Крука пратакол за быццам бы незаконны распаўсюд газеты ў памяшканні райвыканкама і паабяцаў даслаць яго ў пракуратуру. Пратакол падпісалі падначаленыя чыноўніка — Валейка і Блажкевіч. І гэта нягледзячы на тое, што «Новы час» — зарэгістраваная газета. Магчыма, іх увяло ў зман, што «Новы час», у адрозненні ад «Народнай волі» і «Нашай нівы», не атрымаў дазволу на распаўсюд праз сістэму «Белпошты» і «Белсаюздруку».

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ПАДПІСКА ПАД ПРЫМУСАМ

**Язэп ПАЛУБЯТКА**

**На адрас рэдакцыі «Новага часу» пошта прынесла ліст з адміністрацыі Першамайскага раёна.**

У лісце за подпісам намесніка кіраўніка адміністрацыі В. Богдана, кіраўнікам прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый выказваецца падзяка за павялічэнне колькасці ведамаснай падпіскі ў другой палове 2008 года, што садзейнічала «больш аператыўнаму інфармаванню жыхароў раёна і працоўных калектываў і арганізацый усіх форм уласнасці аб дзейнасці выканаўчых органаў улады».

Далей намеснік кіраўніка адміністрацыі просіць кіраўнікоў арганізацый (на іх ускладаецца абавязак правядзення падпіскі) узяць пад асабісты кантроль правядзенне ведамаснай падпіскі з улікам усіх структурных падраздзяленняў, аддзелаў і службаў (цэхаў, бібліятэк, пакоеў адпачынку, арганізацый-арандатараў і г.д.).

Ведамасная падпіска, паводле меркавання В. Богдана, павінна ўключыць 14 найменняў, сярод якіх газета «Советская Белоруссия», "Народная газета", "Звязда", "Рэспубліка" і ншыя ведамыя дзяржаўныя выданні.

Адміністрацыя Першамайскага раёна таксама прапануе правесці ў працоўных калектывах тлумачальную працу аб індывідуальнай падпісцы. Надалей копіі падпісных квітанцый неабходна накіраваць у аддзел ідэалагічнай працы райвыканкама.

ЗАКЛІК

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ ДА ДАБРАЧЫННАЙ АКЦЫІ!

**Грамадская арганізацыя «Беларуская асацыяцыя журналістаў» сумесна з журналістамі розных выданняў ладзіць дабрачынную калядную акцыю для дзяцей з дзіцячага дома ў пасёлку Станькава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці.**



Запрашаем усіх жадаючых, у тым ліку і журналістаў, далучыцца да акцыі і разам павіншаваць дзяцей з Калядамі і Новым годам. Кожны з нас можа зрабіць невялікую добрую справу: падрыхтаваць падарункі дзецям, зладзіць для іх невялікае свята. Не палянуйцеся ахвяраваць маленькай часткай свайго часу — для дзетак найперш важная ваша ўвага.

Візіт у Станькаўскі Дзіцячы дом плануецца на пачатку наступнага года. Калі вы хочаце далучыцца да дабрачыннай акцыі, звязвайцеся з арганізатарамі па тэлефонах: **+ 375 29 5566684 або +375 29 1783168.**

Зробім добрую справу разам!

## ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ. ПАДЗЕІ ТЫДНЯ

### 20-ГОД «МАРТЫРАЛОГУ»

**МАГІЛЁЎ.** Магілёўская арганізацыя ТБМ зладзіла вечарыну, прысвечаную 20-годдзю абласной філіі «Мартыралога Беларусі». Ініцыятарам яе стварэння ў свой час выступіла выкладчыца культпрасветвучэльні Тамара Раманькова, а ўзначаліў — заслужаны дзеяч культуры БССР Валянцін Ермаловіч. Распачаўся актыўны збор звестак аб месцах масавых расстрэлаў у ваколіцах горада. На самым буйным з іх — былым скотамагільніку саўгаса «Давыдаўка» — неўзабаве быў пастаўлены крыж. Штогод на Дзяды тут збіраюцца людзі, каб ушанаваць памяць ахвяраў палітычных рэпрэсій. На вечарыне прысутнічалі кандыдат гістарычных навук Валянцін Голубеў, былы віцэ-мэр Магілёва Віталь Васількоў і шмат іншых удзельнікаў тагачасных падзей.

### СУПРАЦІЎ НАРАСТАЕ

**АСТРАВЕЦ, ГОРКІ, ЧАВУСЫ.** Па словах начальніка аддзела міжнароднага супрацоўніцтва дэпартамента па ядзернай энергетыцы Мінэнерга Ліліі Дулінец, 22–23 снежня пройдзе пасяджанне дзяржаўнай камісіі, якую ўзначальвае міністр энергетыкі Аляксандр Азярэц. Плануецца вырашыць пытанне выбару пляцоўкі для пабудовы АЭС. Нягледзячы на тое, што перавага аддаецца будоўлі ў Астравецкім раёне, будуць разглядацца Краснапалянская (Чавускі раён) і Кукшынаўская (Шклоўскі раён) пляцоўкі.

Першымі акцыі пратэсту супраць пабудовы АЭС распачалі жыхары Магілёўшчыны. Зараз створана ініцыятыва «Антыядзерная група», якая распачала збор подпісаў грамадзян супраць будаўніцтва АЭС на тэрыторыі Беларусі незалежна ад яе месца знаходжання. Новастворaная ініцыятыва «Астравецкая атамная — злачынства» таксама актывізавала сваю дзейнасць і актыўна праводзіць збор подпісаў супраць пабудовы АЭС у гэтым рэгіёне. Некалькі дзён таму ў райвыканкам пададзена заяўка на правядзенне мітынга пратэсту супраць пабудовы АЭС.

### ВЯРТАННЕ З НЕБЫЦЦЯ

**АШМЯНЫ.** На пачатку снежня на базе цэнтральнай раённай бальніцы адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя «Хімія і біяхімія біялагічна актыўных субстанцый». Яна была прысвечана 240-годдзю са дня нараджэння земляка, таленавітага навукоўца, педагога, грамадскага дзеяча, прафесара Віленскага універсітэта Андрэя Снядэцкага, аўтара аднайменнай навуковай працы таго часу. У канферэнцыі акрамя беларусаў прынялі ўдзел госці з Польшчы.

Адраджэнне імя сусветна знакамітага земляка распачалося некалькі тыдняў таму, калі ў Кульчынскай сярэдняй школе адбылася яшчэ адна навукова-практычная канферэнцыя «З мінулага ў будучыню». Тады на Ашмяншчыну прыехалі не толькі палякі, але і літоўцы.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЛЯБЕДЗЬКУ ПРАВЕРЫЛІ ЗА 18 ГАДОЎ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Улады вырашылі змагацца з карупцыяй у апазіцыі. Татальную праверку фінансавых сродкаў ужо апрабавалі на кіраўніку Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатолю Лябедзьку.**

Падатковая інспекцыя скрупулёзна пералічыла прыбыткі аднаго з апазіцыйных лідэраў ажно за 18 гадоў. І гэтая цяжкая і няўдзячная праца мела поспех. За 2001 год у Лябедзькі выяўлена перавышэнне выдаткаў над пазначанымі ім у дэкларацыі прыбыткамі ў памеры… 741 352 рублёў (прыкладна 340 долараў).

Начальнік падатковай інспекцыі Цэнтральнага раёну г. Мінска Дзмітры Саладухін патрабуе ад Лябедзькі на працягу 30 дзён прадставіць у падатковую інспекцыю «ў пісьмовай форме тлумачэнні пра крыніцы грашовых сродкаў (з пазначэннем дат, спосабу атрымання і іх памеру)», за кошт чаго ў Лябедзькі атрымалася перавышэнне сумаў. А таксама праінфармаваць аб вяртанні пазыкі па дамове за жнівень 2002 года.

Да патрабавання даць тлумачэнні прыкладаецца 18 лістоў з пералічэннем выдаткаў палітыка за 18 гадоў — з пачатку 1990 года.



ІНСПЕКЦЫЯ МІНІСТЭРСТВА ПА ПАДАТКАХ І ЗБОРАХ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ЦЭНТРАЛЬНАМУ РАЁНУ г. МІНСКА

Приложение 3-2
к Инструкции о порядке организации деятельности налоговых органов по контролю за соблюдением порядка декларирования физическими лицами доходов, имущества и источников денежных средств

16.10.2008 № 44-19/10049

**Требование о даче пояснений.**

**Уважаемый Лебедько Анатолий Владимирович!**
**проживающий по адресу: г. Минск, ул. Л.Украинки, д.4, к.1, кв.353.**

Инспекцией Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Центральному району г. Минска было установлено превышение сумм расходов над суммами, заявленными Вами в декларации о доходах и имуществе № 4-4-24/ Д-Л-57 от 28.07.2008 (доходов), в размере:
За 2001 год – 741 352 рубля.

В соответствии со статьей 11 Закона Республики Беларусь «О декларировании физическими лицами доходов, имущества и источников денежных средств» Вам следует в течение 30-ти дней со дня вручения данного требования представить в инспекцию Министерства по налогам и сборам по Центральному району г. Минска, которая располагается по адресу: 220005 г. Минск, пр. Машерова, 7, комн. 202, в письменной форме пояснения об источниках денежных средств (с указанием дат, способа получения и их размера), за счет которых Вами были произведены вышеуказанные расходы. Также просим в данном пояснении представить информацию по факту возврата займа по договору займа, заключенного в августе 2002.

В случае непредставления в указанный срок пояснений с сумм превышения расходов над доходами будет исчислен и предъявлен к уплате налог.

Необходимую консультацию Вы можете получить по тел. 289 56 17 у старшего государственного налогового инспектора Подвойской Татьяны Александровны.

Приложение: на 18 л. в 1 экз.

Заместитель начальника инспекции –
начальник управления контроля
за индивидуальными предпринимателями
и физическими лицами Д.Ю. Солодухин

4-4 Подвойская 283 22 34
trebovanie.doc

Сярод асноўных артыкулаў фігуруюць камунальныя плацяжы, аплата за тэлефоны — хатні і мабільны, а таксама адміністратыўныя штрафы.

Паводле словаў Лябедзькі, калі ён запаўняў дэкларацыі раней, прэтэнзій да яго не было. Але цяпер перад ім пастаўлена задача ўзгадаць свае крыніцы даходаў сем гадоў таму і патлумачыць з'яўленне лішку грошай. Інакш, папярэдзіў Дзмітры Саладухін, «будзе спаганы і прад'яўлены да аплаты падатак».

«Калі б Лукашэнка так кантраляваў сваіх уласных чыноўнікаў, то карупцыя ў Беларусі здохла б ключыць да выбівання сродкаў з апазіцыі і падатковыя службы. Не сакрэт, што палітычныя рэпрэсіі ўлада даўно ўжо перавяла на камерцыйную аснову. Чаго толькі варты Еўрапейскі марш, за які шасцёра заяўнікаў былі аштрафаваны на некалькі тысяч долараў. З моманту правядзення акцыі мінула ўжо больш за год, а судовыя выканаўцы дагэтуль спаганяюць штраф з арганізатараў, пагражаючы канфіскаваць маёмасць.

Улічым, што на двары сусветны фінансавы крызіс, і гэта патрабуе дадатковых намаганняў для папаўнення дзяржаў-

**«Не здзіўлюся, калі ў мяне раптам запатрабуюць справаздачы за хлеб і каўбасу, з'едзеныя ў 1993 годзе, і чэкі за шкарпэткі, зношаныя 15 гадоў таму»**

на працягу года, — мяркуе Анатоль Лябедзька. — Наш сямейны бюджэт складаецца не толькі з маіх сродкаў. Жонка працуе. Я мог проста браць у кагосьці грошы — сваіх родных ці блізкіх. Гэта нармалёвая жыццёвая сітуацыя. Трэба чакаць, што маразм будзе мацнець. Не здзіўлюся, калі ў мяне раптам запатрабуюць справаздачы за хлеб і каўбасу, з'едзеныя ў 1993 годзе, і чэкі за шкарпэткі, зношаныя 15 гадоў таму».

Можна меркаваць, што ўслед за судамі ўлады вырашылі пад-

най казны. Як лічыць Анатоль Лябедзька, ён першы, але не апошні з апанентаў улады, хто павінен будзе трымаць адказ за кожную выдаткаваную капейку. Пры гэтым зусім не істотна, што тыя дзяржаўныя чыноўнікі, якіх Лукашэнка па прозвішчах назваў карупцыянерамі, працягваюць працаваць на сваіх пасадах. У тым ліку і суддзі, якія спецыялізуюцца на палітычных расправах — караюць штрафамі і адпраўляюць за краты апазіцыйных палітыкаў і актывістаў.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# СВАБОДА ВЫПІЦЬ І ЗАКУСІЦЬ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Беларусь 10 снежня адзначыла Дзень правоў чалавека. Усеагульная Дэкларацыя правоў чалавека гарантуе чалавеку права на свабоду слова, свабоду сходаў, свабоду перасоўвання, а таксама свабоду выпіць і закусіць. І ў 60-я ўгодкі прыняцця Дэкларацыі ўлады Мінска замахнуліся на самае святое — на права выпіць і закусіць.**

З 10 снежня ў Мінску не засталося ніводнага гандлёвага шапіка на прыпынках грамадскага транспарту. Згодна з пастановай Мінгарвыканкама, знеслі ўсе такія гандлёвыя аб'екты. Прычым знеслі разам з навесамі, якія абаранялі людзей ад снегу і дажджу. Зараз, калі крамы зачыняюцца ў 8–10 гадзінаў вечара, тым, хто працаваў у другую змену, не давядзецца набыць сабе нават шакаладкі, каб падтрымаць змучаны напружанай працай арганізм.

Андрэй Новікаў, намеснік начальніка ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгандлю, кажа, што «альтэрнатыва шапікам з'явілася яшчэ два гады таму ў выглядзе гандлёвых цэнтраў». А тое, што пасля 10 вечара набыць ежу амаль нерэальна, спадар Новікаў пракаментаваў так: «Праблемы бачныя на настроі масаў. Калі праблема ўзнікне, будзем думаць аб прадаўжэнні графіка працы крамаў».

Спадар Новікаў відавочна разважыўся не толькі працаваць да ночы, але і карыстацца грамадскім транспартам. Можна параіць масам толькі адно — выцягнуць спадара Новікава з ягонага ўтульнага кабінета і прымусіць прастаяць на «голым» прыпынку пад снегам і дажджом хвілінак з трыццаць у чаканні аўтобуса ці тралейбуса. Калі ён у выніку схопіць запаленне лёгкіх, гэта ягоная персанальная праблема. Здаецца, толькі так масы здолеюць прымусіць спадара Новікава прыслухацца да іх.

Яшчэ лепшы варыянт — завесці спадара Новікава ў гіпермаркет і прымусіць яго дачакацца аўтобуса там.

Што тычыцца іншых пытанняў нацыянальнага скарбу беларусаў — «чаркі ды шкваркі», то тут на тыдзень асобны клас людзей павінен радавацца, што дачакаўся нейкай палёгкі. Міністэрства эканомікі выступіла з прапановай працягнуць на год для індывідуальных прадпрымальнікаў льготны рэжым увозу тавараў з Расіі. Пра гэта акурат 10 снежня заявіў намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур. «Мы ўнеслі праект указу, дзе 2009 год мяняецца на 2010», — сказаў ён.

Нагадаем, 1 студзеня спыняецца дзеянне пункта 3 указа № 285 «Аб некаторых мерах па рэгуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці», у адпаведнасці з якім ІП — плацельшчыкі адзінага падатку могуць не мець дакументаў на ўвезены імі тавар з Расіі і выплачваюць увазны падатак на дададзеную вартасць у фіксаванай суме.

Але гэта заява прадпрымальнікаў больш раззлавала, чым узрадавала. «Пэўны час таму Тур казаў, што льготны рэжым працягнуты не будзе. Сёння ён кажа, што міністэрства ўнесла прапановы. Справа ў тым, што гэта ўсяго толькі праект. Такіх праектаў у адміністрацыі ляжыць цэлы стос. Мы чакаем у найбліжэйшы час менавіта ўказу аб працягу рэжыму працы прадпрымальнікаў на ранейшых умовах. Толькі пры з'яўленні такога дакумента мы зробім адэкватныя крокі», — паведаміў адзін з арганізатараў «Марша прадпрымальнікаў» Анатоль Шумчанка.

Аднак ёсць і добрая для ўсіх навіна перад святамі. Харчовыя крамы ў Мінску 25, 31 снежня 2008 года і 7 студзеня 2009 года будуць працаваць з звычайным рэжыме. Больш за тое, 31 снежня буйныя магазіны будуць працаваць да 22.00. Апрача таго, у ноч з 31 снежня на 1 студзеня да дзвюх гадзін будзе працаваць супермаркет «Карона». 1 студзеня 2009 года харчовыя крамы будуць працаваць з 10.00 да 18.00. І яшчэ больш — у перадсвяточныя дні аб'ектам гандлю і грамадскага харчавання забаронена закрывацца на рамонт, пераўлік, санітарны дзень!

Во далі, дык далі! Можна параіць у святочныя дні за «чаркай і шкваркай» у крамы не хадзіць, а закупацца загадзя. Цэгла, канешне, як сказаў адзін персанаж «Майстра і Маргарыты», знянацку на галаву не падае, але ж раптам нешта зваліцца ў краме, якой забаранілі праводзіць рамонт? З другога боку, ніякага іншага выйсця ўлады не пакінулі — шапікі ж пазносілі. Так што перад святамі можна чакаць не толькі масавага грашовага фінансавання крамаў з боку насельніцтва, але і павелічэння пабытавага і працоўнага траўматызму. Памятаеце, як у пазамінулым годзе са столі Камароўкі навярнулася свіння, якая павінна была ўпрыгожваць гэты рынак?

Але іншым часам трэба і дзяліцца! Як паведаміла начальнік фінансава-эканамічнага ўпраўлення «Мінсктранс» Ганна Міхайлоўская, за 10 месяцаў гэтага года Мінсктранс прадаў праязных квіткоў амаль на 53 мільярды рублёў больш, чым летась. Яна кажа, што маштабную ролю згуляла адмена льгот і ўзмацненне кантролю за аплатай. За кошт узмацнення кантролю прыбыткі выраслі прыкладна на 6,5 мільярда. Атрымліваецца, што дзякуючы адмене льгот «Мінсктранс» зарабіў больш за 46 мільярдаў рублёў, або больш за 21 мільён долараў.

Вось хто някае па кубышках беларускія скарбы! Вось хто сваёй скнапнасцю прывёў у Беларусь міжнародны фінансавы крызіс! Гэта пенсіянеры і студэнты, у якіх забралі льготы ў мінулым годзе! А калі б не забралі, а пакінулі, у якой бы яміне апынулася беларускае машынабудаўніцтва і пасажырскія перавозкі? Жудасна ўявіць!

Між тым, «Мінсктранс» так і не дамовіўся з міліцыяй пра дапамогу ў барацьбе з "зайцамі". Праваахоўнікі некалькі гадоў таму не працягнулі кантракт з транспартнікамі. Цяпер кантралёр можа толькі папрасіць «зайца» пакінуць транспарт або скласці на яго пратакол, калі безбілетнік пагодзіцца. Спецыяльныя аўтобусы з міліцыяй і кантралёрамі на прыпынках так і не з'явіцца.

Дарэчы, трэба, у мэтах эканоміі і беражлівасці, зусім скасаваць грамадскі транспарт. У той час, калі колькасць прыватных аўто вырасла настолькі, што іх няма куды ставіць, грамадскі транспарт робіцца ўвогуле непатрэбным. Вось цікавая навіна прыйшла са Смалявіцкага раёна. Там вясковыя настаўніцы дабіраюцца да школы аўтастопам, бо інакш яны не паспеюць на ўрокі з адной вёскі ў іншую. І справа ў не ў тым, што вясковым настаўнікам не выдзяляліся грошы на праезд. Справа ў тым, што аўтобусы там ходзяць два разы ў дзень туды і два — назад.

Вось так і ўсім трэба: эканомія і беражлівасць, беражлівасць і эканомія! Бо крызіс…

▸ АКЦЫЯ

# ІП СТРАЙКУЮЦЬ І РЫХТУЮЦЦА ДА МІТЫНГАЎ

Вольга ХВОІН

**Вынікі года індывідуальныя прадпрымальнікі падводзяць акцыямі пратэсту. У сераду, 10 снежня, па дадзеных арганізатараў страйку, не працавалі каля 40 працэнтаў індывідуальных прадпрымальнікаў.**




Photo.ByMedia.Net

На 15 снежня ў сталіцы запланаваны мітынг прадпрымальнікаў. Прычынаю пратэстаў стала тое, што з першага студзеня 2009 года страчвае сілу пункт 3 указа № 285 ад 18 чэрвеня 2005 года, такім чынам адмяняецца фіксаваная стаўка падатку на ўвоз тавараў з Расіі, адкуль завозіць тавары большасць дробных гандляроў. Ад новага года яны мусяць мець на кожны тавар накладныя дакументы і выплачваць адпаведныя падаткі. Для працы ІП гэта вялікая перашкода, бо тавары яны набываюць у асноўным у такіх жа дробных гандляроў, якія не маюць магчымасці забяспечыць беларускіх калег адпаведнымі дакументамі. Акрамя таго, з 1 студзеня 2008 года індывідуальныя прадпрымальнікі не могуць прыцягваць больш трох наёмных працаўнікоў, якія, да таго ж, павінны быць блізкімі сваякамі.

Страйк у Міжнародны дзень правоў чалавека ініцыявала ГА «За вольнае развіццё прадпрымальніцтва» пад кіраўніцтвам Віктара Гарбачова, а таксама Каардынацыйная рада прадпрымальнікаў на чале з Аляксандрам Макаевым. Як паведамілі інфармацыйнаму агенцтву БелаПАН арганізатары страйку, 10 снежня часткова не працавалі прадпрымальнікі на буйных рынках у Мінску, Барысаве, Слуцку, Салігорску, Пінску, Віцебску. Прадпрымальнік Аляксандр Цацура з Салігорску паведаміў карэспандэнту «НЧ», што каля 95 працэнтаў гандляроў на гарадскім рынку не выйшлі на працу. Некалькі дзесяткаў чалавек сабраліся каля гарвыканкама і перадалі ўладам горада дакументы з пералікам сваіх патрабаванняў. «Здаецца, чыноўнікі нас падтрымліваюць, бо яны таксама разумеюць, што працаваць у новых умовах будзе немагчыма, — адзначае прадпрымальнік. — Людзі ведаюць, што 15 снежня ў Мінску будзе мітынг, і калі нічога не зменіцца, то гатовыя ехаць у сталіцу і пратэставаць ужо там».

Юрыст і эканаміст Сяргей Балыкін лічыць, што калі ў наступным годзе пагоршыцца сітуацыя ва ўнутраным гандлі, то дакладна назваць яе прычыны будзе складана. «Я думаю, што з-за крызісу будуць такія праблемы, прычыну якіх вызначыць цяжка — ці гэта адбылося з-за абмежавання ўмоў працы дробнага бізнесу, ці з-за агульнай макраэканамічнай сітуацыі, — адзначае эксперт. — Што тычыцца імкнення такім спосабам вывесці дробны гандаль з ценю, то гэта неапраўдана. Існуе мноства схем, як, маючы на руках дакументы на тавар, можна прадаваць неафармленыя партыі. Гэтыя схемы ведаюць нават студэнты акадэміі МУС». Не лічыць Сяргей Балыкін важкім аргументам пераход прадпрымальнікаў і гандляроў у катэгорыю беспрацоўных: «Наўрад ці ўсе прадпрымальнікі кінуцца станавіцца на біржу працы. А паказчыкі беспрацоўя ў нас вызначаюцца па афіцыйнай статыстыцы. Такім чынам, агульная статыстычная карціна не надта зменіцца».

Лідэр Каардынацыйнай рады прадпрымальнікаў Аляксандр Макаеў гаворыць, што галоўнае патрабаванне ІП — пакінуць цяперашнія ўмовы працы і прыняць закон аб малым бізнесе, які дазволіць дробным гандлярам больш-менш стабільна працаваць. «Мы разлічваем, што ў «Маршы прадпрымальнікаў» 15 снежня прымуць удзел некалькі тысяч чалавек. Хацелася б дзесяткаў тысяч, але гэта малаверагодна. Прадпрымальнікі мусяць зразумець, што без салідарнасці нам не адстаяць сваіх правоў. Каб нечага дабіцца, нам засталося толькі страйкаваць і ўдзельнічаць у вулічных акцыях», — адзначае прадпрымальнік. Разам з тым Аляксандр Макаеў падрыхтоўку да акцыяў пратэсту назваў «нездавальняючай».

У дзень страйку прадпрымальнікаў 10 снежня афіцыйнае інфармагенцтва БЕЛТА распаўсюдзіла інфармацыю, што Міністэрства эканомікі Беларусі прапаноўвае на год падоўжыць для індывідуальных прадпрымальнікаў палёгкавы рэжым увозу тавараў з Расіі. Аб гэтым заявіў намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур на семінары Бізнес-саюза прадпрымальнікаў. «Мы ўнеслі праект указу, дзе 2009 год замяняецца на 2010», — паведаміў чыноўнік.

Калі пытанне ўмоў дробнага гандлю не вырашыцца цягам снежня, то ў пачатку студзеня 2009 года прадпрымальнікі абяцаюць правесці шэраг бестэрміновых акцый пратэсту.

▸ ЖЫЦЦЁ

# КРЫЗІС ПАДКРАДВАЕЦЦА І ДА БЕЛАРУСІ

Вольга ХВОІН

**Беларускія прадпрыемствы на хвалі эканамічнага крызісу паступова пазбаўляюцца ад рабочых.**

Так, філіял Мінскага маторнага завода ў Стоўбцах перайшоў на чатырохдзённы графік вытворчасці ў адну змену. Як паведамляе «Польскае радыё», з асобамі, у якіх заканчваюцца працоўныя кантракты, не працягваюць дамовы. Іншыя, бачачы сітуацыю, самастойна прымаюць рашэнне звольніцца. Пасля навагодніх святаў на заводзе плануюцца масавыя скарачэнні. Агулам, за некалькі апошніх тыдняў, працу на ММЗ у Стоўбцах страцілі каля 50 чалавек. На пытанне рабочых аб прычынах зменаў на заводзе кіраўніцтва ММЗ адказвае каротка: «Крызіс». Асобныя прадпрыемствы арганізуюць прымусовыя выходныя на некалькі дзён. Прадпрыемства «Гуматэхніка» ў кастрычніку не працавала адзін дзень, у лістападзе — чатыры дні. На Мінскім трактарным заводзе звальняюць за парушэнне дысцыпліны. Супрацоўнікам Мінскага электратэхнічнага завода імя Казлова прапаноўваюць браць адгулы, а навагоднія святы працягнуцца аж цэлых два тыдні.

У прэс-службе Міністэрства прамысловасці сказалі, што інфармацыяй пра магчымыя скарачэнні не валодаюць: «Ніхто ў міністэрстве пра гэта нічога не ведае. Мы не даем каментараў на гэтую тэму. Тэлефануйце на прадпрыемствы і там пытайцеся. А кожны дзень каментаваць гэтыя чуткі мы не ў стане». У прэс-службе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны паведамілі, што факты звальнення рабочых ім не вядомыя. «Так, прадпрыемствы вымушаныя пераходзіць на скарочаны рабочы тыдзень. Гэта вымушаная часовая мера. Але мы пільна сочым за тым, каб ніхто не парушыў загад прэзідэнта не выкідаць людзей на вуліцу. Калі камусьці прапаноўваюць добраахвотна звольніцца, то гэта з'яўляецца парушэннем заканадаўства. Такія асобы могуць звяртацца ў міністэрства са скаргамі. Мы нават вывесілі на сайце адмысловую юрыдычную інфармацыю».

Скарачэнні пагражаюць не толькі рабочым, але і «белым каўнерыкам». Так, адзін з супрацоўнікаў «ДэльтаБанка» паведаміў, што ў сувязі са змяншэннем аб'ёмаў крэдытавання кіраўніцтва банка ўносіць істотныя змены ў кантракт — многіх супрацоўнікаў пераводзяць на 0,25 працоўнай стаўкі, што складае 2 працоўныя гадзіны ў дзень. Як варыянт, прапануюць звольніцца па ўласным жаданні і абяцаюць выплаціць у якасці кампенсацыі адзін аклад. Супрацоўнік банка, які захацеў застацца невядомым, гаворыць, што агенты сыходзяць з працы, бо такія ўмовы для іх не прымальныя, тыя ж, хто застаюцца, шукаюць дадатковыя падпрацоўкі. Намесніца старшыні праўлення банка патлумачыць, што адбываецца ў кадравай палітыцы арганізацыі, адмовілася.

Паводле афіцыйнай статыстыкі, беспрацоўе ў краіне на 1 снежня складала 0,8 працэнта ў адносінах да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Самы нізкі ўзровень беспрацоўя — усяго 0,3 працэнта — у сталіцы.

Уплыў сусветнага крызісу на эканоміку Беларусі нарэшце прызнала і кіраўніцтва дзяржавы. На пасяджэнні Савета міністраў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі сказаў, што «крызіс захоплівае ўсё больш дзяржаў, і яго ўплыў на эканоміку Беларусі ўзмацняецца, улічваючы, што наша эканоміка экспартаарыентаваная, крызіс уплывае на базавыя галіны». Па словах прэм'ера, першачарговымі антыкрызіснымі мерамі павінны стаць скарачэнне выдаткаў у рэальным сектары эканомікі шляхам цвёрдай эканоміі рэсурсаў з аднachасовым падтрыманнем канкурэнтаздольнасці беларускіх экспарцёраў на традыцыйных рынках і пошук новых рынкаў збыту беларускай прадукцыі. Прэм'ер вылучыў прынятае рашэнне па дзяржпадтрымцы банкаўскай сістэмы, рашэнне ўрада аб магчымасці фарміраваць экспартныя кошты, зыходзячы з кан'юнктуры рынку, і планы ўрада прыняць аналагічныя рашэнні пры рэалізацыі прадукцыі на ўнутраным рынку. Кіраўнік урада таксама падкрэсліў неабходнасць прыняць меры па лібералізацыі эканомікі.

У сувязі з наступствамі эканамічнага крызісу кіраўніцтва Беларусі перагледзела планы развіцця эканомікі краіны на наступныя паўгода. Як паведаміў міністр эканомікі Беларусі Мікалай Зайчанка, прагназуецца паніжэнне тэмпаў росту ВУП Беларусі ў І квартале 2009 года да 5 працэнтаў, а па выніках першага паўгоддзя — да 7 працэнтаў. Ранейшы план сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2009 год прадугледжваў рост ВУП на 10–12 працэнтаў.

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, які нядаўна заяўляў, што ў Беларусі крызісу няма, на апошняй нарадзе з прэм'ер-міністрам Сяргеем Сідорскім і старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Пятром Пракаповічам параіў чыноўнікам «на ўсялякі выпадак рыхтавацца да найгоршага сцэнару».

ФІНАНСЫ

# СУСВЕТНЫ БАНК СТВАРАЕ РЭЗЕРВЫ КРЭДЫТНАГА ЗАПАСУ

Вольга ХВОІН

**З-за сусветнага фінансавага крызісу бліжэйшыя перспектывы эканамічнага росту ў краінах, якія развіваюцца, выглядаюць нявызначана, а аб'ёмы сусветнага гандлю, па ўсёй верагоднасці, упершыню з 1982 года скароцяцца. Запаволенне эканомікі прывяло да абвалу коштаў на сыравінныя тавары, пяцігадовы сыравінны бум, які ўвайшоў у гісторыю, скончыўся. Такія высновы агучаны ў штогадовым дакладзе «Глабальныя эканамічныя перспектывы», падрыхтаваны экспертамі Сусветнага банка.**




Эксперты прагназуюць, што ў 2008 годзе сусветны ВУП вырасце на 2,5 працэнты, а ў 2009 годзе — толькі на 0,9 працэнты. У краінах, якія развіваюцца, тэмпы эканамічнага росту, па ўсёй верагоднасці, знізяцца і ў будучым годзе складуць 4,5 працэнты (у параўнанні з 7,9 працэнта ў 2007 годзе), у краінах з высокім узроўнем прыбыткаў будзе назірацца адмоўны рост эканомікі. «Краінам, што развіваюцца, давядзіцца пераадольваць наступствы двух маштабных знешніх зрушэнняў: рэзкага росту коштаў на прадукты харчавання і паліва, а таксама фінансавага крызісу, які хоць і паслабіў напружанасць на рынках сыравіны, але выпрабоўвае на трываласць банкаўскія сістэмы і пагражае скарачэннем працоўных месцаў па ўсім свеце, — адзначае Джасцін Лін, галоўны эканаміст і віцэ-прэзідэнт Сусветнага банка па эканоміцы развіцця. — Неабходныя тэрміновыя меры, якія паспрыяюць змякчэнню негатыўнага ўздзеяння крызісу на рэальную эканоміку і бяднейшыя пласты насельніцтва. Сярод іх — праекты, накіраваныя на ўдасканаленне аўтадарожнай і чыгуначнай сетак, сістэмаў школьнага навучанні і медыцынскага абслугоўвання».

З прычыны крызісу Група Сусветнага банка пашырае маштабы сваёй падтрымкі краін, што развіваюцца, у тым ліку за кошт рэзервавання на бліжэйшыя тры гады новых крэдытных рэсурсаў Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця аб'ёмам да 100 мільярдаў долараў ЗША, а таксама па лініі Міжнароднай фінансавай карпарацыі — арганізацыі Групы Сусветнага банка, якая падтрымлівае долю сектару, праз механізмы фінансавання гандлю, рэкапіталізацыі банкаў і садзейнічанне праектам у сферы інфраструктуры.

Паводле прагнозаў, у наступным годзе аб'ёмы сусветнага гандлю скароцяцца на 2,1 працэнта, што азначае істотнае паніжэнне экспарту з краінаў, што развіваюцца. Вынікам больш жорсткіх умоў крэдытавання ў 2009 годзе стане запаволенне прыросту інвестыцый і ў краінах, што развіваюцца, і ў краінах з высокім узроўнем прыбыткаў. На практыцы, у развітых краінах чакаецца паніжэнне аб'ёму інвестыцый на 1,3 працэнта, а ў краінах, якія развіваюцца, прырост будзе ўсяго на 3,5 працэнта, у параўнанні з леташнімі 13 працэнтамі.

У першай палове года тэндэнцыя да хуткага росту коштаў на сыравіну на фоне хуткага паніжэння тэмпаў росту сусветнай эканомікі змянілася на процілеглую: пачынаючы з ліпеня гэтага года, кошты практычна на ўсё сыравінныя тавары сталі рэзка падаць. Але, хоць рэальныя кошты на харчаванне і паліва істотна знізіліся, яны застаюцца высокімі ў параўнанні з узроўнем 1990-х гадоў. Увогуле, з-за падвышэння коштаў на харчаванне і паліва спажыўцы ў краінах, што развіваюцца, сёлета панеслі дадатковыя выдаткі ў аб'ёме прыкладна 680 мільярдаў долараў ЗША, ад 130 да 155 мільёнаў чалавек ізноў апынуліся за рысай беднаты. Эксперты Сусветнага банка прагназуюць, што ў надыходзячым годзе нафта будзе каштаваць у сярэднім каля 75 долараў за барэль, а кошты на харчаванне знізяцца на 23 працэнта ў параўнанні з іх сярэднегадавым узроўнем.

> Эксперты Сусветнага банка прагназуюць, што ў надыходзячым годзе нафта будзе каштаваць у сярэднім каля 75 долараў за барэль, а кошты на харчаванне знізяцца на 23 працэнта

Звяртаючыся да больш доўгатэрміновым перспектыў, аўтары дакладу робяць выснову, што на працягу бліжэйшых 20 гадоў прапанова будзе з лішкам задавальняць попыт. Чакаецца, што дэфіцыт, якія спрыяў рэзкаму росту цэнаў на сыравінныя тавары, будзе змяншацца. Рост попыту на энерганосьбіты, металы і харчаванне павінен запаволіцца. Гэта звязана з паніжэннем прыросту насельніцтва, а таксама з чаканай зменай тэндэнцыі да маштабнага попыту на метал у Кітаі на процілеглую па меры паніжэння тэмпаў прыросту інвестыцый у краіне.

Аўтары прыйшлі да высновы, што багатыя карысным выкапнямі краіны распараджаліся звышпрыбыткамі ад нядаўняга сыравіннага буму больш разумна, чым у мінулым, гэта павінна дапамагчы ім лягчэй перажыць паніжэнне коштаў. Разам з тым, у зоне рызыкі могуць апынуцца тыя краіны, дзе карысныя выкапні былі выяўленыя нядаўна, а таксама тыя, што празмерна налеглі на банкаўскія крэдыты. Гэта тлумачыцца тым, што з паніжэннем коштаў на сыравінныя тавары прыбытак многіх кампаній скарачаецца, у той жа час працэнтныя стаўкі растуць, і калі прыходзіць час вяртаць крэдыты, рэзка ўзрастаюць выдаткі на іх абслугоўванне.

На фоне гэтых працэсаў кіраўніцтва дзяржаў мусіць садзейнічаць інвестыцыям у фарміраванне дадатковага патэнцыялу прапановы і актывізаваць укараненне мер па рэсурсазберажэнню і падвышэнню эфектыўнасці, што дазволіць збалансаваць прапанову сыравінных тавараў і попыт на іх.

Эксперты сусветнага банка раяць палітыкам уважліва сачыць за сітуацыяй у банкаўскай сістэме сваіх краін і быць гатовымі звярнуцца да знешняй дапамогі для падтрымкі нацыянальнай валюты і банкаўскай сістэмы. З улікам чакаемага скарачэння аб'ёмаў сусветнага гандлю кіраўніцтва дзяржаў мусіць супрацьстаяць спакусе ўвесці пратэкцыяністкія меры, якія толькі падоўжаць і пагоршаць крызіс.

## НАВІНЫ

### СТАТУТНЫ ФОНД ПАВЯЛІЧЫЎСЯ

**ААТ «Прыёрбанк» павялічыла статутны фонд з 270 мільярдаў рублёў да 412 мільярдаў рублёў, ці на 52,6%.**

Як паведамляецца ў прэс-рэлізе «Прыёрбанка», павелічэнне статутнага фонду ажыццёўлена за кошт сродкаў асноўнага акцыянера банка — «Райфайзен Інтэрнэшнл Банк Холдынг АГ», які дадаткова інвеставаў у капітал банка 50 мільёнаў еўра. Такім чынам, агульны аб'ём інвестыцый «Райфайзенбанка» ў капітал «Прыёрбанка» з 2003 года склаў 80 мільёнаў еўра.

«Унясенне дадатковых інвестыцый «Райфайзенбанкам» з'яўляецца значным стратэгічным крокам па развіцці бізнесу банка і ўмацаванні яго рыначных пазіцый на фінансавым рынку краіны, што становіцца асабліва актуальным ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу», — сказаў старшыня праўлення «Прыёрбанка» Сяргей Касцючэнка.

Новы статутны фонд банка зарэгістраваны Нацыянальным банкам Беларусі 27 лістапада 2008 года. Адпаведна дэпартаментам па каштоўных паперах Міністэрства фінансаў унесеныя змены ў Дзяржаўны рээстр па каштоўных паперах.

**Даведка:** «Прыёрбанк» з'яўляецца найбуйнейшым банкам краіны з удзелам замежнага капіталу. Цяпер з улікам дадатковых інвестыцый асноўнаму акцыянеру — «Райфайзен Інтэрнэшнл Банк Холдынг АГ» — належыць 87,72% акцый «Прыёрбанка». Прыцягненне дадатковых замежных інвестыцый дазволіла «Прыёрбанку» павялічыць сваю рыначную пазіцыю па памеры капіталу да 7,6% і перамясціцца па гэтым паказчыку ў рэйтынгу беларускіх банкаў з пятай на трэцюю пазіцыю.

### КРЭДЫТНЫЯ РЭЙТЫНГІ

**Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Moody's Investors Service прысвоіла крэдытныя рэйтынгі ЗАТ «МТБанк»: доўгатэрміновы рэйтынг «B2», кароткатэрміновы рэйтынг Not Prime па дэпазітах у нацыянальнай і замежнай валюце і рэйтынг фінансавай устойлівасці банка «E+». Усе рэйтынгі маюць прагноз «Стабільны».**

Як паведамляецца ў прэс-рэлізе «МТБанка», эксперты Moody's адзначаюць істотную дыверсіфікацыю крэдытнага партфеля банка, адэкватнае становішча ліквіднасці і высокую дастатковасць капіталу. У паведамленні агенцтва гаворыцца, што гэтыя паказчыкі павялічваюць перспектывы далейшага росту банка.

«МТБанк» стаў першым сярод недзяржаўных беларускіх банкаў, якія не з'яўляюцца пры гэтым даччынымі банкамі буйных расійскіх банкаўскіх груп і якія атрымалі міжнародны рэйтынг. У «МТБанку» таксама звяртаюць увагу на той факт, што ў сітуацыі сусветнага фінансавага крызісу, калі ўсе рэйтынгавыя агенцтвы прыкметна ўзмацнілі падыходы да аналізу банкаўскіх паказчыкаў і рызык, ён стаў першым беларускім банкам, які прайшоў працэдуру першаснага прысваення міжнароднага рэйтынгу.

**Даведка:** ЗАТ «МТБанк» зарэгістравана Нацбанкам Беларусі 14 сакавіка 1994 года. Кантрольнымі акцыянерамі банка з'яўляюцца Міжнародны аўтамабільны холдынг «Атлант-М» (каля 65%) і інвестыцыйны фонд Horizon Capital (каля 33%). Яго філіялы размешчаны ў Мінску, Віцебску, Брэсце, Гомелі, Магілёве, Маладзечне, Бабруйску. Актывы банка на 1 лістапада 2008 года склалі 407,7 мільярда рублёў, уласны капітал — 110 мільярдаў рублёў. За 10 месяцаў 2008 года банк зарабіў чысты прыбытак у памеры 16,1 мільярда рублёў (рост 216,5% у параўнанні з аналагічным паказчыкам 2007 года).

Рэйтынгавае агенцтва Moody's Investors Service — вядучае сусветнае рэйтынгавае агенцтва, якое дае шырокі спектр розных крэдытных рэйтынгаў і сістэм ацэнкі рызык. Цяпер агенцтва прысвойвае рэйтынгі дзяржаўным і камерцыйным структурам у 100 краінах.

### МІСІЯ ТЭХНІЧНАГА САДЗЕЯННЯ

**8 снежня ў Мінск прыбыла місія тэхнічнага садзеяння па пытаннях грашова-крэдытнай палітыкі Міжнароднага валютнага фонду.**

Пра гэта паведамілі ў беларускім прадстаўніцтва МВФ. Эксперты будуць знаходзіцца ў Беларусі паводле запрашэння Нацыянальнага банка да 15 снежня. Затым у Мінск павінна прыбыць місія МВФ, якая будзе працягваць перамовы з прадстаўнікамі ўрада па пытанні выдзялення Беларусі стабілізацыйнага крэдыту ў 2 мільярда долараў. Чакаецца, што місія прыбудзе 15 снежня.

З просьбай аб выдзяленні крэдыту Беларусь звярнулася да МВФ у сярэдзіне кастрычніка. Як растлумачылі ў Нацбанку, крэдыт патрэбны для «павелічэння дзяржаўных золатавалютных рэзерваў і стварэння «падушкі бяспекі», неабходнай для стабільнай працы эканомікі ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу». Першы раунд перамоў па крэдыце праходзіў з 27 кастрычніка па 22 лістапада, падчас візіту ў Мінск місіі МВФ. Як заявіў пасля ад'езду місіі першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка Павел Калаур, беларускі бок пазітыўна ацэньвае ход перамоў з МВФ і спадзяецца на завяршэнне іх у снежні. Пры гэтым чыноўнік не пацвердзіў і не абверг інфармацыю аб тым, што ў якасці адной з умоў выдзялення крэдыту МВФ прапаноўвае 20-працэнтную дэвальвацыю беларускага рубля. Паводле слоў П. Калаура, МВФ не выстаўляе Мінску жорсткіх умоў, а звяртае ўвагу на неабходнасць адэкватнай карэкціроўкі курсу з улікам змянення абменных курсаў іншых валют.

Паводле БелаПАН

▸ **КАНТРАСТЫ**

# У КРАІНЕ КАПІТАЛІСТЫЧНАГА КАМУНІЗМУ

Вольга ХВОІН

**Сучасная Малдова — дзікая сумесь капіталізму і савецкай спадчыны. Кавярні ў савецкім стылі з невыводным пахам вакзальных чабурэкаў мірна суіснуюць з фірмовымі крамамі тыпу «Армані» на галоўным праспекце малдаўскай сталіцы.**





Тут жа можна прайсці сто метраў па навюткіх ходніках, а наступныя сто — па ўшчэнт разбітай тратуарнай плітцы. На фоне старасвецкіх і, варта прызнаць, досыць занядбаных дамоў раз-пораз з'яўляюцца сучасныя індустрыяльныя будынкі са шкла і бетону. Найноўшая гісторыя і Беларусі, і Малдовы паўставала з адной крыніцы, імя якой СССР, але цяпер мы розныя, і праблемы ў нас, пры іх агульным падабенстве, індывідуальныя.

Паводле статыстыкі, у Малдове, без уліку Прыднястроўскага рэгіёну, цяпер жыве больш за 3,5 мільёны чалавек. Але самі жыхары гавораць, што прыкладна адзін мільён малдаван у краіну хіба толькі на пабыўку прыязджае — працуюць у Расіі ці Еўропе. За час паміж двума апошнімі перапісамі (1989 і 2004 гадоў) колькасць насельніцтва скарацілася прыкладна на 350 тысяч чалавек — многія назаўсёды з'ехалі з краіны ў пошуках лепшага жыцця. На вуліцах Кішынёву народу насамрэч нямнога, тым больш моладзі ва ўзросце ад дваццаці год. Прычына ўсё тая ж — хто на заробкі з'язджае, а хто на вучобу. У студэнтаў найбольшым попытам карыстаюцца універсітэты Еўропы. Малдаўская мова належыць да раманскай групы моў, таму выхадцам з гэтай краіны лёгка даюцца італьянская ды французская мовы, для тых, хто імкнецца зрабіць кар'еру, абавязковай з'яўляецца англійская. Выкладчык аднаго з універсітэтаў Кішынёву нават падзяліўся меркаваннямі наконт таго, што праз колькі гадоў на навуковых канферэнцыях перакладчыкі з англійскай на рускую ды малдаўскую не будуць патрэбныя. Дарэчы, выехаць на вучобу ў Румынію (а гэта, між іншым, ужо Еўрасаюз) не так складана.

У адным з восеньскіх нумароў румынскай газеты «Ziua» прыводзіцца статыстычныя дадзеныя, паводле якіх на сёння каля ста тысяч грамадзян Рэспублікі Малдова адначасова з'яўляюцца і грамадзянамі Румыніі. На чарзе ў румынскім Міністэрстве замежных спраў чакаюць свайго разгляду больш за восемсот тысяч заяў ад малдаван на атрыманне або аднаўленне страчанага імі румынскага грамадзянства.

І вось тут пачынаецца самае цікавае. Каб не быць галаслоўнай, зноў жа прывяду факты статыстыкі. А факт, як пісаў Булгакаў, самая ўпартая рэч. Вясною 2007 года Інстытут маркетынгу і сацапытанняў «IMAS Chisinau» высвятляў адносіны грамадзян Малдовы да ўзаемадачыненняў з іншымі краінамі і міжнароднымі структурамі. Каля 67 працэнтаў рэспандэнтаў выказаліся за ўступленне Малдовы ў Еўрасаюз. Зрэшты, нічога дзіўнага. Сяброўства ў ЕС абяцае пэўныя эканамічныя выгоды, аўтаномію ад Расіі, перспектывы для моладзі, якая ўжо цяпер імкнецца з'ехаць у краіны пад блакітным сцягам з залатымі зоркамі. Але... Амаль палова — 45 працэнтаў рэспандэнтаў — лічыць, што для ўступлення ў ЕС Малдова павінна звярнуцца па дапамогу да іншых краін, і амаль палова апытаных выказалі меркавання, што найперш тут можа дапамагчы Румынія. Каб стала больш зразумела, што хаваецца за гэтымі лічбамі, прывяду словы малдаўскага калегі, старшыні Саюзу журналістаў Малдовы Валерыя Сахарняну: «Мы марым пра аб'яднанне з Румыніяй».

Нягледзячы на тое, што беларусы больш за дзесяць год чуюць словы пра аб'яднанне з Расіяй, яны ўжо трывала прызвычаіліся быць грамадзянамі самастойнага (хаця гэта пытанне спрэчнае) і незалежнага дзяржаўнага ўтварэння. Размовы пра аб'яднанне цяпер, па вялікаму рахунку, успрымаюцца менавіта як размовы, а не як пасыл да дзеяння. І гэта, між іншым, нас аб'ядноўвае і дорыць нейкую надзею на будучыню: сябе і сваіх дзяцей мы бачым грамадзянамі менавіта Беларусі, а не краіны-суседкі. Жыць у сваёй хаце ўсё ж куды больш прыемна і надзейна, чым у хаце сястры, добрай ці нядобрай. Менавіта таму акрэсленыя вышэй памкненні грамадзян Малдовы ўводзяць у ментальны ступар — асэнсаваць і зразумець іх мару страціць незалежнасць няпроста.

Зазвычай, калі вяртаешся з той ці іншай краіны, задаюць пытанні пра дабрабыт — так ужо сталася, што да відовішчаў чалавеку хочацца і хлеба. У Малдове сярэдні заробак складае прыблізна 250 долараў. Як і ў Беларусі, найменш атрымліваюць вяскоўцы, а таксама працаўнікі лясной гаспадаркі — каля 150 долараў. Калі ў Беларусі ўсе прыблізна «пад адзін грэбень стрыжаныя», то ў Малдове адчуваецца значная сацыяльная пярэстасць: дарагія машын і буцікі, кошты на вопратку і абутак у адной са сталічных крамаў нічым не саступалі мінскім. І ўсё гэта на фоне нейкага гаспадарчага запусцення. Мясцячкоўцы тлумачаць, што многія дасылаюць родзічам грошы, зарабляючы за мяжой. Нехта стварае за кардонам пэўны капітал, пасля вяртаецца на радзіму і адкрывае сваю справу. Нехта жыве на дзве сям'і — нярэдкі спадарожнік гастарбайтэрства.

Малдова пакідае неадназначнае ўражанне: тут можна паглядзець на пафарбаваныя ў аднолькавы ружовы колер старасвецкія пабудовы, а вечарам ўваліцца ў яміну на ходніках, тут можна сустрэць гасцінных гаспадароў краіны, але так і не ўбачыць аптымізму і надзеі ў іх вачах. Мы чымсьці падобныя: нашчадкі Саюза, маем праблемы з дабрабытам, свабодаю слова, хочам, каб нашая моладзь не з'язджала за доўгім рублём... Разам з тым Малдова і Беларусь абсалютна розныя ў ментальнасці, бачанні сваёй будучыні. І справа не толькі ў тым, што ў нас папулярная вішнёвая наліўка, а ў іх — вінаграднае віно.

▸ **З НАГОДЫ**

# СССР — СНГ — ???

**Семнаццаць гадоў таму спыніў існаванне СССР і была створана Садружнасць Незалежных Дзяржаў .**

8 снежня 1991 года ў рэзідэнцыі Віскулі ў Белавежскай пушчы кіраўнікі Беларусі, Расіі і Украіны падпісалі пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Гэтак званыя «Белавежскія пагадненні» паклалі канец 69-гадовай гісторыі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Прычым аб спыненні існавання СССР як суб'екта міжнароднага права і геапалітычнай рэальнасці абвясцілі лідэры трох савецкіх рэспублік, якія ў 1922 годзе яго і заснавалі.

Праз 13 дзён, 21 снежня, у Алма-Аце кіраўнікі 11 новых суверэнных дзяржаў (апрача прыбалтыйскіх краін і Грузіі) падпісалі пратакол да пагаднення аб стварэнні СНД, у якім падкрэслілі, што Азербайджанская Рэспубліка, Рэспубліка Арменія, Рэспубліка Беларусь, Рэспубліка Казахстан, Кіргізская Рэспубліка, Рэспубліка Малдова, Расійская Федэрацыя, Рэспубліка Таджыкістан, Туркменістан, Рэспубліка Узбекістан і Украіна на раўнапраўных пачатках ствараюць Садружнасць Незалежных Дзяржаў. Пагадненні сустрэчы прынялі дэкларацыю, што пацвердзіла прыхільнасць былых саюзных рэспублік да супрацоўніцтва ў розных галінах знешняй і ўнутранай палітыкі, абвясціла гарантыі выканання міжнародных абавязацельстваў былога СССР. У снежні 1993 года да СНД далучылася Грузія. Цяпер гэтая краіна знаходзіцца ў стане выхаду з міждзяржаўнага аб'яднання. Грузія пакіне СНД 18 жніўня 2009 года.

Садружнасць дзейнічае на падставе статута, прынятага Саветам кіраўнікоў дзяржаў 22 студзеня 1993 года. У ім вызначаны ўмовы сяброўства дзяржаў у СНД, сфармуляваны мэты і прынцыпы калектыўнай бяспекі і ваенна-палітычнага супрацоўніцтва, прадухілення канфліктаў і вырашэння спрэчак, узаемадзеяння ў эканамічнай, сацыяльнай і прававой галінах, міжпарламенцкіх сувязей, замацавана суверэнная



роўнасць усіх яго сябраў. Падкрэслена, што дзяржавы, якія ўваходзяць у СНД, з'яўляюцца самастойнымі і раўнапраўнымі суб'ектамі міжнароднага права.

Садружнасць не з'яўляецца дзяржавай і не валодае наднацыянальнымі паўнамоцтвамі. Узаемадзеянне краін у межах СНД ажыццяўляецца праз яго інстытуты каардынацыі: Савет кіраўнікоў дзяржаў, Савет кіраўнікоў урадаў, Міжпарламенцкую асамблею, Выканаўчы камітэт, які з'яўляецца правапераемнікам Выканаўчага сакратарыята СНД і Міждзяржаўнага эканамічнага камітэта Эканамічнага саюза і інш.

**Вячаслаў Будкевіч, БелаПАН.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 15 СНЕЖНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

---

**05.30** Дакументальна-пазнавальны серыял «Таямнічы свет жывёл» (Францыя).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Nota Bene.
**09.35** Здароўе.
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Мой муж - алкаголік».
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Авантурная меладрама «Аферысты» (Расія-Украіна).
**14.00** «Музыка для ўсіх». Канцэртная праграма.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.05** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**16.50** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 01.10** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.35** Арэна. Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50** Паўфінал Нацыянальнага тэлевізійнага праекту «Еўрафэст». Прамая трансляцыя.
**23.35** Крымінальная камедыя «Удар па сістэме» (ЗША).
**01.20** Дзень спорту.
**01.30** Усе стыхіі.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30,.**
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Контуры.
**10.10** «Дыханне планеты».
**10.45** Ералаш.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.50** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** Шматсер. фільм «Ключы ад смерці».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера АНТ: Рэаліці-шоў «Пасаг для нявесты».
**17.30** «Жарт за жартам».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Спадчына».
**22.15** «След». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Кашпіроўскі супраць Чумака».
**00.30** «Прафесійны бокс».
**01.30** Нашы навіны.
**01.45** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Наша справа».
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Ваенная таямніца».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Мая хата».
**14.20** «Горад дзяцінства».
**14.35** «Крутыя рабяты». Народнае шоў. Паўфінал.
**15.35** «Я - вандроўца».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Спартовы тыдзень».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Шавец». Расія, 2002 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.05** «Закон і крымінал».
**00.10** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.20** «Сталічны футбол».
**00.50** «Гучная справа».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Тэлебарометр.
**08.40** Усё аб бяспецы.
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.00** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.55** Рамантычная камедыя «Сустрэнемся ў фантана» (СССР).
**12.15** Слова пісьменніка.
**12.45** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**13.35** Бухта капітанаў.
**14.15** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**14.40** Пазакласная гадзіна.
**14.50** Гіпноз.
**15.45** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.35** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.05** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.10** Навіны культуры.
**18.25** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Дынама (Мінск) - ВГК ім. Мяшкова (Брэст). Прамая трансляцыя.
**20.00** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-1» (Расія).
**21.20** Калыханка.
**21.30** Серыял «Ад'ютант яго высакароднасці» (СССР). Заключная серыя.
**23.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**00.15** Хакей. Формула гульні.

---

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.00** Фільм «У ноч месяцовага зацьмення». 1978 г.
**10.30** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.25** Пакой смеху.
**12.35** Фільм «Дажджы ў акіяне».1994 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Ян Шмялёў. Шляхі зямныя». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Сумленны дэтэктыў».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**20.40** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».2008 г.
**21.45** Тэлесерыял «Жанчыны ў гульні без правіл», Расія, 2004 г. Заключная серыя.
**22.50** Навіны - Беларусь.
**23.00** «Весткі+».
**23.20** «Кулагін і партнёры».
**23.55** «Кіно нямое і відушчае». Дакументальны фільм.
**00.45** Заканчэнне эфіру.

---

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.45** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**09.05** «Сёння. Выніковая праграма».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.00** Сёння.
**13.30** Камедыя «Забі, мяне! Ну, калі ласка».
**15.10** «Рускія не здаюцца!».
**15.30** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «І зноў добры дзень!».
**23.00** Сёння.
**23.35** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».
**01.10** «Школа зласлоўя».

---

EUROSPORT

**09.30** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
**10.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Мужчыны. Эстафета.
**11.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Жанчыны. Эстафета.
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Італіі (Прагелата). Кваліфікацыя. HS 140.
**13.30** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Мужчыны. Эстафета.
**14.30** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Жанчыны. Эстафета.
**15.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**00.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.45** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 3-і.

## 16 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

---

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Арэна. Праграма аб спорце.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.10** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-2» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Белавежжа» цыклу «Зямля беларуская».
**15.45** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**16.45** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 01.35** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Ваенны дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**00.00** Трылер «Мсцівец» (ЗША).
**01.45** Дзень спорту.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** Шматсерыйны фільм «Спадчына».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** Шматсер. фільм «Ключы ад смерці».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**18.55** Прэм'ера. «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Спадчына».
**22.15** «След». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм.
**00.25** «Не жадаю аджаніцца».
**01.25** Нашы навіны.
**01.40** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Закон і крымінал».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.35** Фільм «Шавец». Расія, 2002 г.
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Гучная справа».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.20** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.50** «Шырокая рака». Серыял.
**22.00** «Рэпарцёр СТБ».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.20** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Закон і крымінал».
**00.30** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.40** «Рэактыўны бокс».
**01.10** «Надзвычайныя гісторыі».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-1» (Расія).
**09.20** У гэты дзень.
**09.25** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.15** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**12.00** Хакей. Формула гульні.
**12.30** Кінааповесць «Шукай ветру» (СССР).
**13.50** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.35** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Бітва экстрасэнсаў.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-1» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.05** Калыханка.
**21.30** Прыгодніцкі фільм «Балада аб доблесным рыцары Айвенга» (СССР).
**23.20** Спорт-кадр.
**23.50** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

---

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**10.05** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Жанчыны ў гульні без правіл», Расія, 2004 г.
**12.25** Фільм «Шукайце і знойдзеце».1969 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Пра што маўчаў баечнік. Яўген Шварц». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Падарожжы музыкі».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**20.40** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».2008 г.
**21.40** Серыял «Расійская імперыя. Пачатак». Фільм 1. «Царэвіч Аляксей».2007 г.
**22.50** Навіны - Беларусь.
**23.00** «Весткі+».
**23.20** «Кулагін і партнёры».
**23.55** «Бітва за звышгук. Праўда аб Ту-144». Дакументальны фільм.
**00.45** Заканчэнне эфіру.

---

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «І зноў добры дзень!».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.50** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Добрыя хлопцы».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР-2».
**15.10** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «Следства вялі...».
**23.00** Сёння.
**23.35** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».

---

EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальны спорт. Моладзевая зона.
**10.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Італіі (Прагелата). Кваліфікацыя. HS 140.
**11.30** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Мужчыны. Эстафета.
**12.30** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Жанчыны. Эстафета.
**13.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 3-і.
**14.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**15.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Вось дык так!!!
**19.45** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**00.00** «Формула-1». Часопіс.
**01.00** Ралі. Ралійная серыя IRC у Кітаі. Агляд.
**01.30** Ралі. Чэмпіянат свету. Агляд сезону.

## 17 снежня, серада

---

**05.05** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-2» (ЗША).
**13.50** Альманах вандраванняў.
**14.25** Моладзевы камедыйны серыял «Клініка» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.45** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**16.40** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.50** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.50, 01.35** Ваенны дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**23.05** Камедыйны трылер «Сямейка Роуз» (Францыя).
**01.00** Дзень спорту.
**01.10** Моладзевы камедыйны серыял «Клініка» (ЗША).

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.00** Шматсерыйны фільм «Спадчына».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.50** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** Шматсер. фільм «Ключы ад смерці».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**18.55** Прэм'ера. «Рудая». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Спадчына».
**22.15** «След». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм.
**00.25** Тэорыя неверагоднасці. «Мужчына і жанчына».
**01.25** Нашы навіны.
**01.40** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Закон і крымінал».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Шырокая рака». Серыял.
**09.50** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Надзвычайныя гісторыі».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Рэпарцёр СТБ».
**14.20** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэактыўны бокс».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Дабро пажаліцца».
**20.50** «Шырокая рака». Серыял.
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.20** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Закон і крымінал».
**00.30** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.40** «Зоркі спорту».
**01.05** «Дэтэктыўныя гісторыі».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-1» (Расія).
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.20** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.10** Свая музыка.
**11.35** Пасоўванне +.
**12.05** Спорт-кадр.
**12.30** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**13.20** Кіначасопіс для дзяцей «Жадаю ўсё ведаць» (Расія).
**14.10** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**14.30** Пазакласная гадзіна.
**14.45** «Касмапалітэн». Відэаверсія.
**15.35** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.30** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.05** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.10** Навіны культуры.
**18.25** Хакей. Кубак Палесся. Беларусь - Францыя. Прамая трансляцыя.
**20.50** Калыханка.
**21.15** Беларуская часіна.
**22.10** «Іншыя». «Пікнік на абочыне».
**22.45** Хакей. НХЛ. Манрэаль - Караліна.

### РОССИЯ телеканал

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**10.05** Тэлесерыял «Райскія яблычкі». 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.25** Серыял «Расійская імперыя. Пачатак». Фільм 1. «Царэвіч Аляксей».2007 г.
**12.30** Фільм «Р.В.С.». 1977 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Ланцужная рэакцыя».Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Тэатральны летапіс». Частка 1-я.
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**20.40** Тэлесерыял «Райскія яблычкі». 2008 г.
**21.40** Серыял «Расійская імперыя. Пачатак». Фільм 1. «Царэвіч Аляксей». 2007 г.
**22.50** Навіны - Беларусь.
**23.00** «Весткі+».
**23.20** «Кулагін і партнёры».
**23.55** Прэм'ера. «Цудоўны князь. Р. Пацёмкін».
**00.45** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Дачны адказ».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Пакой адпачынку».
**10.50** «Галоўная дарога».
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Добрыя хлопцы».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР-2».
**15.10** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.35** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «Залатая качка».
**23.00** Сёння.
**23.30** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».

### EUROSPORT

**09.30** Восль дык так!!!
**09.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Агляд сезону.
**10.45** Ралі. Чэмпіянат свету. Агляд сезону.
**11.45** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. Дзень 4-ы.
**12.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**13.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 4-ы.
**15.00** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. Дзень 4-ы.
**16.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 5-ы. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Абранае па серадах.
**19.25** Конны спорт. Кубак свету ў Швейцарыі (Жэнева). Канкур.
**20.25** Пола. Турнір «Triple Corona» у Аргенціне.
**21.25** Навіны коннага спорту.
**21.30** Гольф-клуб.
**21.35** Ветразны спорт. Рэгата Volvo Ocean.
**21.40** Яхт-клуб.
**21.45** «Спартовы курорт». Часопіс.
**22.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 5-ы. Прамая трансляцыя.
**00.00** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. Дзень 5-ы. Агляд.
**00.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 5-ы.
**01.30** Ралі. Чэмпіянат свету. Агляд сезону.

## 18 снежня, чацвер

---

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.10** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-2» (ЗША).
**13.50** «Уласнай персонай».
**14.25** Моладзевы серыял «Клініка» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.45** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**16.40** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 01.00** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50, 01.45** Ваенны дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**23.05** Прыгодніцкі баявік «Удача» (Расія).
**01.10** Дзень спорту.
**01.20** Моладзевы серыял «Клініка» (ЗША).

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.00** Шматсерыйны фільм «Спадчына».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.50** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** Шматсер. фільм «Ключы ад смерці».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**18.55** Прэм'ера. «Рудая». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Спадчына».
**22.15** «След». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Застацца ў жывых». Шматсер. фільм.
**00.25** «Дакументальны дэтэктыў».
**01.00** Нашы навіны.
**01.15** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Закон і крымінал».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** «Шырокая рака». Серыял.
**09.50** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.50** «Шырокая рака». Серыял.
**22.00** «Асабісты інтэрас».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.20** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Закон і крымінал».
**00.30** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.40** «Гарачы лёд».
**01.10** «Сакрэтныя гісторыі».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** «Міжнародны цыркавы фэст у Монтэ-Карла». Забаўляльная праграма (Францыя) . 1-я частка.
**09.20** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.10** Невытлумачальна, але факт.
**10.55** Медычныя таямніцы.
**11.25** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**13.05** У гэты дзень.
**13.10** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.00** Пазакласная гадзіна.
**14.10** Танцы без правіл.
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**16.50** Кіначчасопіс «Жадаю ўсё ведаць».
**17.05** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.10** Навіны культуры.
**18.25** Хакей. Кубак Палесся. Латвія - Беларусь. Прамая трансляцыя.
**20.50** Калыханка.
**21.15** Беларуская часіна.
**22.10** «Проста праграма».
**23.00** Фільм-прыпавесць «Бунюэль і стол цара Саламона» (Іспанія-Мексіка-Германія).

### РОССИЯ телеканал

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Серыял «Вядзьмарскае каханне».
**10.05** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.25** Серыял «Расійская імперыя. Пачатак». Фільм 1. «Царэвіч Аляксей».2007 г.
**12.30** Фільм «Свістун». 1993 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Ленінградская справа. Забіць сакратара». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Відавочнае-неверагоднае».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Серыял «Вядзьмарскае каханне».
**20.40** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».
**21.40** Серыял «Расійская імперыя. Пачатак». Фільм 2. «Царскае паляванне».
**22.50** Навіны - Беларусь.
**23.00** «Весткі+».
**23.20** «Кулагін і партнёры».
**23.55** «Паміж сваімі сувязь жывая...». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.45** «Прафесія-рэпарцёр».
**09.10** «Залатая качка».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Асоба небяспечны!».
**10.55** «Дужанне за ўласнасць».
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Добрыя хлопцы».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР-2».
**15.10** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.45** «Да бар'ера!». Ток-шоў.
**23.00** Сёння.
**23.35** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. Дзень 5-ы. Агляд.
**10.00** Ралі. Чэмпіянат свету. Агляд сезону.
**11.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Мужчыны. Эстафета.
**11.30** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Мужчыны. Індывідуальная гонка. Прамая трансляцыя.
**13.15** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. Дзень 5-ы.
**13.45** Восль дык так!!!
**14.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Жанчыны. Эстафета.
**15.15** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Жанчыны. Індывідуальная гонка. Прамая трансляцыя.
**17.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 6-ы. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Мужчыны. Індывідуальная гонка.
**20.15** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Жанчыны. Індывідуальная гонка.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 6-ы. Прамая трансляцыя.
**00.00** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. Дзень 5-ы. Агляд.
**01.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Жанчыны. Індывідуальная гонка.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 19 СНЕЖНЯ, ПЯТНІЦА

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона X.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-2» (ЗША).
**13.50** Шпілька.
**14.25** Моладзевы камедыйны серыял «Клініка» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.45** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**16.45** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Я стала ахвярай бабніка».
**17.50** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**19.30** Зона X. Вынікі тыдня.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Фантастычны серыял «Героі» (ЗША).
**23.45** Трылер «Смерць on-line» (ЗША).
**01.30** Дзень спорту.
**01.40** Моладзевы камедыйны серыял «Клініка» (ЗША).

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.00** Шматсерыйны фільм «Спадчына».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.50** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** Шматсерыйны фільм «Ключы ад смерці». Заключная серыя.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсерыйны фільм.
**17.15** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Злачынствы стагоддзя».
**18.55** Поле цудаў.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Цырымонія ўручэння прэміі «Срэбны грамафон».
**22.35** Прэм'ера. Фільм «Сад».
**01.35** Нашы навіны.
**01.50** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Закон і крымінал».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Шырокая рака». Серыял.
**09.50** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Прыватныя гісторыі».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Асабісты інтэрас».
**14.20** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**14.30** «Элен і рабяты -2». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Гарачы лёд».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Дыска». Францыя, 2008 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.45** Фільм «Паветраны паляўнічы». ЗША.




**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** «Міжнародны цыркавы фэст у Монтэ-Карла». Забаўляльная праграма (Францыя). 2-я частка.
**09.15** У гэты дзень.
**09.20** «Спорт, спорт, спорт...».
**09.45** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.25** Шоў Ньюз.
**11.50** Лабірынты: Чарэя Сапегаў.
**12.15** Лірычная камедыя «Адзін у навагоднюю ноч» (Украіна). 1-я серыя.
**13.50** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.40** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.15** Школа рамонту.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Усё аб бяспецы.
**19.20** Гіпноз.
**20.30** Калыханка.
**20.45** Бітва экстрасэнсаў.
**21.50** Танцы без правіл.
**23.00** Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй» (ЗША).

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**10.05** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».
**11.00** Весткі.
**11.25** Серыял «Расійская імперыя. Пачатак». Фільм 2. «Царскае паляванне».2007 г.
**12.30** Фільм «Мужчыны ёсць мужчыны», 1985 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Зорнае каханне Віталя Саломіна».
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Сто прычын для смеху».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**21.25** Фільм «Чырвоны жэмчуг кахання», Расія, 2008 г.
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** Камедыя «Самазабойца». 1990 г.
**01.00** Заканчэнне эфіру.

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Галоўны герой».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Хвацкія 90-я».
**10.50** «Авіятары».
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Добрыя хлопцы».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР-2».
**15.20** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.30** «Агляд. Выратавальнікі».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**20.05** «Суперстар-2008. Каманда мары».
**22.40** Трылер «Парфумер: Гісторыя аднаго забойцы».
**01.30** «Усё адразу!».

**09.30** Санкавы спорт. Кубак свету ў Германіі (Вінтэрберг).
**10.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Мужчыны. Індывідуальная гонка.
**11.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Жанчыны. Індывідуальная гонка.
**11.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Швейцарыі (Сэнт-Морыц). Жанчыны. Хуткасны спуск. Камбінацыя. Прамая трансляцыя.
**13.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Лёсаванне. Прамая трансляцыя.
**13.30** Футбол. Кубак УЕФА. Групавы этап. Дзень 5-ы.
**14.00** Футбол. Кубак УЕФА. Лёсаванне. Прамая трансляцыя.
**14.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Швейцарыі (Сэнт-Морыц). Жанчыны. Хуткасны спуск. Камбінацыя.
**14.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Швейцарыі (Сэнт-Морыц). Жанчыны. Слалам. Камбінацыя. Прамая трансляцыя.
**15.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Швейцарыі (Энгельберг). Кваліфікацыя. Прамая трансляцыя.
**16.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 7-ы. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.30** Цімберспорт. Чэмпіянат Еўропы ў Аўстрыі.
**20.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў (Расія).
**21.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 7-ы. Прамая трансляцыя.
**00.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.30** Экстрэмальны спорт. Моладзевая зона.
**01.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 7-ы.

## 20 СНЕЖНЯ, СУБОТА

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).




**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона X.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** Існасць.
**09.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Здароўе.
**09.45** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.15** Шпілька.
**10.50** Ранішняя хваля.
**11.25** Брытва Окама.
**12.10** Эксцэнтрычная камедыя «Каханне злое...» (Расія).
**13.40** «Будні чэмпіёнаў».
**14.10** Дакументальны фільм «Таямніцы забытых перамог» (Расія).
**14.35** «Аўтапартрэт. Невядомы мастак». Відэафільм АТН.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Зона X. Вынікі тыдня.
**16.35** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**17.35** «Ваша лато». Вынікі 2008 года».
**18.00** «Ваша лато».
**18.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.30** «Музыка для ўсіх». Канцэртная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.45** Вострасюжэтная крымінальная драма «Рай» (Германія- Італія-ЗША).
**23.45** «Уласнай персонай».
**00.10** Моладзевы гумарыстычны серыял «Клава, давай!» (ЗША).

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.40** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Кветкі як цуд». Дак. фільм.
**11.35** Тэлечасопіс «Саюз».
**12.05** «Леанід Бранявой. Пад каўпаком у Мюлера».
**13.05** Фільм «Простыя рэчы».
**14.55** Юбілейны вечар Ю. Мікалаева.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Юбілейны вечар Ю. Мікалаева. Працяг.
**17.45** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.50** «Ледніковы перыяд».
**20.00** Вялікая палітыка.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ледніковы перыяд». Працяг.
**23.20** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.00** Што? Дзе? Калі?

**07.00** «Ваенная таямніца».
**07.50** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**08.15** Фільм-казка «Аб трох рыцарах і прыгажуні «. Чэхаславакія, 1996 г.
**09.30** «Мая хата».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.35** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.10** Фільм «Вязень замка Іф». СССР, 1988 г. 3-я серыя.
**15.00** «Я - вандроўца».
**15.30** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.15** «Здаровае дзяцінства».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**16.55** «Народжаныя ў СССР».
**17.40** «Дарагая перадача».
**18.00** «Шырокая рака». Серыял.
**19.00** «Малая Радзіма. Паставы».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Праклён залатой кветкі». Ганконг-Кітай, 2006 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Крутыя рабяты». Народнае шоў. Паўфінал.
**23.55** Фільм «Буча ў Гучы». Германія-Аўстрыя-Балгарыя, 2006 г.

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**08.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** «Версаль. У садах Караля-Сонца». Дакументальны фільм (Францыя).
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Школа рамонту.
**10.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.25** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**12.50** Лірычная камедыя «Адзін у навагоднюю ноч» (Украіна). 2-я серыя.
**14.35** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**16.40** Навіны культуры.
**16.55** Хакей. Кубак Палесся. Прамая трансляцыя.
**19.15** Жаночая ліга.
**19.55** Драма «Колер грошай» (ЗША).
**22.15** Шоў Ньюз.
**22.45** «Казанова». Тэлечасопіс для мужчын.
**23.15** Вайсковая камедыя «ДМБ» (Расія). 1-я і 2-я серыі.

**07.00** Весткі.
**07.10** Экранізацыя рамана «Бацькі і дзеці». 1983 г. 1-я серыя.
**08.30** Мультфільм. «Белы матыль».
**08.40** «Мой срэбны шар».
**09.40** «Суботнік».
**10.25** «Формула ўлады».
**11.00** Весткі.
**11.10** Пакой смеху.
**12.00** «Вакол свету».
**13.00** Дэтэктыў «Марш Турэцкага-3. Фільм 4. «Пярэварацень». 1 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.20** Фільм «Шклянка вады». 1979 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Новая хваля - 2008». Лепшае.
**21.40** Фільм «Выспа», Расія, 2006 г.
**00.00** Фільм «Замак». 1991 г.
**01.55** Заканчэнне эфіру.

**07.25** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Казкі Бажэнава».
**08.45** Мультфільм.
**08.55** «Агляд».
**09.20** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Асоба небяспечны!».
**14.00** Баявік «Шукальнікі прыгод».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Жаночы погляд».
**17.05** Вострасюжэтны фільм «Шпіёнскія гульні: Выслізгвалая мішэнь».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**21.10** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.10** «Ты не паверыш!».
**23.10** Прэм'ера. Дэтэктыўны фантастычны трылер «Лялячка».

**09.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Мужчыны. Індывідуальная гонка.
**11.30** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Мужчыны. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**13.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі (Валь Гардэна). Мужчыны. Хуткасны спуск. Прамая трансляцыя.
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Швейцарыі (Энгельберг). HS 137. Прамая трансляцыя.
**16.30** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Аўстрыі (Рамсау). Скачкі з трампліна.
**17.00** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Аўстрыі (Рамсау). Гонка па сістэме Гундэрсэна. Прамая трансляцыя.
**17.45** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 8-ы. Прамая трансляцыя.
**19.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Жанчыны. Спрынт.
**20.00** Конны спорт. Коннае скачковае шоў (канкур) у Вялікабрытаніі (Лондан).
**21.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 8-ы. Прамая трансляцыя.
**00.00** Покер. Турнір Race Trophy у Аўстрыі (Вена).
**01.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.

## 21 СНЕЖНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**06.20** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну» (Францыя).
**06.45** Прыгодніцкі фільм «Парыжскія таямніцы» (Францыя-Італія).
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Арсенал.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.15** Культурныя людзі.
**10.50** Усе стыхіі.
**11.25** У свеце матораў.
**12.10** Музычная меладрама «Цырк» (СССР).




**14.05** «Альманскія балоты». Відэафільм з цыклу «Асяроддзе пасялення».
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Nota Bene.
**16.05** Камедыя «Укол парасонікам» (Францыя).
**17.55** Суперлата.
**18.50** Крымінальная камедыя «Забіць Бэлу» (Расія).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.35** Вострасюжэтны фільм «Канец свету» (Расія).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная прапаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** Разумніцы і разумнікі.
**12.25** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**13.00** «Дарослыя казкі аб жывёлах». Дакументальны фільм.
**13.30** «Зваротны адлік».
**14.00** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Міжнародная панарама».
**16.40** «Клуб вясёлых і знаходлівых».
**18.55** Прэм'ера АНТ: Рэаліці-шоў «Пасаг для нявесты».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Прэм'ера. «Апошні герой: Забытыя ў раі».
**22.55** Прэм'ера. Фільм «Пенелопа».
**00.55** «Камедзі Клаб».

### СТВ

**06.55** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**07.45** Фільм «Дыска». Францыя, 2008 г.
**09.25** «Аўтапанарама».
**09.55** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.35** «Добры дзень, доктар!».
**13.10** Фільм «Кароткія сустрэчы». СССР, 1967 г.
**15.00** «Культурнае жыццё».
**15.30** «Прыватныя гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэтраманія».
**18.00** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм «Ямакасі: новыя самураі». Францыя, 2001 г.
**22.20** «Спартовы тыдзень».
**22.50** СТБ прадстаўляе: «Каханне-лёс». Канцэрт Я. Паплаўскай і А. Ціханавіча.
**00.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.40** Дабравест.
**08.05** Мір вашай хаце.
**08.20** Бухта капітанаў.
**09.00** Наша пяцёрачка.
**10.05** Кіначасопіс «Жадаю ўсё ведаць» (Расія).
**11.00** Медычныя таямніцы.
**11.40** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**13.25** Пасоўванне +.
**13.40** Гаспадар.
**14.10** «Спявай, душа. by».
**14.40** Жаночая ліга.
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**17.00** Меладраматычны серыял «Дзве зоркі» (Індыя).
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Арсенал - Ліверпуль. Прамая трансляцыя.
**19.55** «Спорт, спорт, спорт...».
**20.30** Тэлебарометр.
**20.50** Правы чалавека.
**21.05** Прыгодніцкая камедыя «Шэсць дзён, сем начэй» (ЗША).
**23.05** Свая музыка.
**23.40** Пасоўванне +.
**00.05** Вайсковая камедыя «ДМБ» (Расія). 3-я і 4-я, заключныя серыі.

### РОССИЯ

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** Экранізацыя рамана «Бацькі і дзеці». 1983 г. 2-я серыя.
**08.25** Мультфільмы. «Сардэчна запрашаем».«Бяскрылае гусянё».
**08.50** «Студыя Здароўе».
**09.25** «Формула ўлады».
**10.00** Прэм'ера. «Гарадок».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Прэм'ера. «Як стаць шчаслівым». Дакументальны фільм.
**13.00** Дэтэктыў «Марш Турэцкага-3. Фільм 4. «Пярэварацень». 2 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.15** Фільм «Эльф нявернік» (Англія). 1997 г.
**16.00** Прэм'ера. «Зорны лёд».
**18.25** «Сумленны дэтэктыў».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** Фільм «Сямейная вячэра», Расія, 2007 г.
**22.05** Прэм'ера. «Імя Расія».
**23.15** Фільм «Біндзюжнік і кароль». 1989 г.
**01.25** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.25** Мультфільмы.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**10.55** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.25** «Авіятары».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Крамлёўскія пахаванні».
**14.15** Баявік «Цені мінулага».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Дужанне за ўласнасць».
**17.05** Вострасюжэтны фільм «Шпіёнскія гульні: Чарнічны пірог».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.10** «Галоўны герой».
**22.20** «Рускія не здаюцца!».
**23.00** «Наша тэма».
**23.30** Прыгодніцкі баявік «Бойня ў Пуэтра Валарта».

### EUROSPORT

**09.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Швейцарыі (Энгельберг). HS 137.
**10.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі (Альта Бадзія). Мужчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**11.45** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Мужчыны. Эстафета. Прамая трансляцыя.
**13.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Швейцарыі (Сэнт-Морыц). Жанчыны. Супергігант.
**13.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі (Альта Бадзія). Мужчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Швейцарыі (Энгельберг). HS 137. Прамая трансляцыя.
**16.30** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Жанчыны. Эстафета.
**17.00** Лыжнае двухбор'е. Кубак свету ў Аўстрыі (Рамсау). Гонка па сістэме Гундэрсэна. Прамая трансляцыя.
**17.45** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
**18.15** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Фінал. Прамая трансляцыя.
**20.00** Конны спорт. Коннае скачковае шоў (канкур) у Вялікабрытаніі (Лондан).
**21.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Фінал.
**22.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Фінал. Прамая трансляцыя.
**01.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Мужчыны. Эстафета.
**02.00** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» распачынае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации Республики Беларусь
№ ________ (по реестру ф. 11)
№ ________ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|
| | | | |

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________ руб.
(сумма прописью)

Кому Куда: Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________

Адрес ____________
(почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

ЦІКАВА

# АПОШНІ ЧЫРВОНЫ ЛІХТАР У КВАРТАЛЕ

Іван БІЧ

**У рамках гарадской рэформы ўлады Амстэрдама вырашылі знішчыць легендарны раён чырвоных ліхтароў.**



Тэрмін «раён чырвоных ліхтароў» прыйшоў з ЗША. Лічыцца, што ўпершыню яго пачалі ўжываць у горадзе Мілуокі. Этымалогію слова звязваюць з чыгуначнікамі, якія, калі ішлі ў падобныя ўстановы, пакідалі звонку чырвоны ліхтар. У выпадку патрэбы адміністрацыя чыгункі магла лёгка знайсці супрацоўніка.

Амстэрдамскі квартал чырвоных ліхтароў называецца Дэ Вален. Ён знаходзіцца ў самым цэнтры гораду. Тут, па афіцыйнай статыстыцы, аказваюць інтымныя паслугі прыблізна 450 асобаў абодвух полаў.

Працоўным месцам ім служаць маленькія пакойчыкі са шклянымі дзвярыма. Працоўная руціна выглядае наступным чынам. Дзяўчыны, апранутыя ў ніжнюю бялізну, стаяць за празрыстымі дзвярыма кабінак. Кліент з вуліцы павінен пагрукаць у шкляныя дзверы. Гаспадыня адчыняе і пачынае весці гандаль наконт ганарару. Калі бакі дасягнулі кампрамісу, госць заходзіць унутр, а на вокны акварыума на час сеансу апускаюцца шторы.

Сярэдняя такса за разавыя паслугі ў Дэ Вален складае недзе ад 60 да 100 еўра. Праўда, большасць з гэтай сумы ідзе не дзяўчыне, а ўладальніку пакою. Звычайна заробак за працоўны дзень складае 100–150 еўра. Акрамя таго ў квартале шмат эратычных тэатраў і клубаў, не кажучы пра так званыя кавашопы — рэстараны, дзе можна набыць марыхуану.

Раён пачаў спецыялізавацца на аказанні такога кшталту паслуг яшчэ з XIV стагоддзя. Першымі кліентамі былі маракі: порт знаходзіўся побач. За гэты час прастытуцыя стала своеасаблівым брэндам кварталу. На цэнтральнай плошчы раёну стаіць бронзавая статуя невядомай прастытуткі з подпісам «Паважайце паўсюдна тых, хто працуе ў сферы сексуальных паслуг». Існуе прафсаюз прастытутак, які часам нават арганізоўвае нешта кшталту дня адчыненых дзвярэй. Прадстаўнікам розных грамадскіх арганізацый і журналістам паказваюць, у якіх умовах зарабляюць на жыццё ў Дэ Вален.



Прастытуцыя ў Галандыі легальная, і паколькі яна прызнана сферай паслуг, то працаваць у раёнах кшталту Дэ Вален маюць права выключна грамадзяне ЕС. Перад тым, як выйсці на працу, яны мусяць прайсці медычную камісію — уладальнік публічнага дому абавязкова патрабуе сертыфікат. Часам паліцыя і медыкі праводзяць рэйды сярод прастытутак у пошуках хворых на СНІД.

Аднак нават самая лепшая дзяржаўная рэгламентацыя не выключае існавання крымінальнага сектару, звязанага з практыкай гандлю людзьмі. Турэцкая і мараканская мафіі маюць свае «Дэ Валены». Тыя, хто там працуе, пазбаўлены ўсялякіх праў. Звычайна дзяўчат вярбуюць недзе ў краінах былога СССР або Трэцяга свету. Трапіўшы ў Амстэрдам, яны патрапляюць пад поўны кантроль уладальнікаў падпольных публічных дамоў. Бегчы ім няма куды: мовы яны не ведаюць, дакументы засталіся ў гаспадара.

Увогуле, паліцыя лічыць, што кабінкі з прастытуткамі не прыносяць вялікіх грошай іх уладальнікам. Фактычна, кожная з іх — частка ланцужку, праз які крымінал адмывае грошы.

Злачыннасць — гэта вечны спадарожнік Дэ Вален. Не дзіўна, што акрамя помніка прастытутцы, ёсць у квартале і помнік ахвярам нелегальнай секс-індустрыі. Помнік прадстаўляе адсечаную руку — сімвал гандлю рабамі ў XIX стагоддзі.

Трэба дадаць, што прафесія прастытуткі — не салодкая нават для тых, хто працуе легальна. Хрысціянская арганізацыя, якая аказвае сацыяльна-прававую дапамогу прастытуткам Дэ Вален, правяла сацыялагічнае апытанне галандскіх грамадзянак, якія працуюць у квартале. Амаль усе яны былі ахвярамі сексуальнага гвалту з боку сутэнёраў або ўладальнікаў публічных дамоў. У 2004 годзе ўлады нават пайшлі на стварэнне камісіі, якая павінна была распрацаваць закон аб барацьбе з такой практыкай. Ідэя закончылася правалам.

Улады даўно коса пазіралі на Дэ Вален. Іх нават не цікавіў той факт, што турыстычная рэклама Амстэрдама будуецца на эксплуатацыі іміджу еўрапейскай сталіцы прастытуцыі.

Пачынаючы з восені 2007 года гарадскі савет Амстэрдама намагаецца крок за крокам ліквідаваць квартал чырвоных ліхтароў. Першай ахвярай кампаніі сталі паўсотні кабінак, якія былі зачыненыя па патрабаванню мэрыі. У студзені 2008-га ў Дэ Вален былі зачыненыя ўсе стрыптыз-клубы.

План развіцця гораду, прыняты на мінулым тыдні, прадугледжвае, што праз дзесяць гадоў квартал чырвоных ліхтароў радыкальна зменіць свой імідж. Гэта будзе звычайны раён гатэляў і рэстаранаў. Прастытуткам прапанавана за кошт дзяржавы прайсці курсы падрыхтоўкі да новых прафесій. Праект рэканструкцыі будзе каштаваць падаткаплацельшчыкам 40 мільёнаў еўра.

Цікавая рэакцыя грамадскасці на палітыку мэрыі. Мясцовыя прадпрымальнікі, якія трымаюць кабінкі, арганізавалі нешта кшталту грамадзянскай ініцыятывы «Платформа 2012» (2012 — код раёна Дэ Вален). Іх, як не дзіўна, падтрымалі дзяўчаткі. Марыска Майло, кіраўнік руху за правы прастытутак, лічыць, што новы профіль раёну не прынясе пазітыўных змен. Па яе словах, зачыненне публічных дамоў у Дэ Вален прывядзе да буму нелегальнай прастытуцыі.

Улады кажуць, што прадбачылі такі варыянт. Па іх словах, цэнтр прастытуцыі проста перанясуць у іншае месца і арганізуюць такім чынам, каб узяць сектар пад больш жорсткі грамадскі кантроль.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Рост коштаў на энерганосьбіты да сусветнага ўзроўню даказаў, што палітычная і эканамічная мадэль, якая створана ў Беларусі, можа існаваць выключна пры ўмове вонкавай рэсурсна-фінансавай падтрымкі. Як толькі падушку бяспекі прыбраць, адразу знікае малюнак стану беларускай гаспадаркі. Можна казаць, што газавы крызіс стаў пачаткам канца беларускай мадэлі. На хуткую мадэрнізацыю няма сродкаў, а палітычная мадэрнізацыя для кіраўніцтва краіны не пажаданая. Застаецца варыянт пераходу пад знешні кантроль. І чым раней гэта будзе зроблена, тым больш у Беларусі застанецца суверэнітэту і ўлады на сваёй тэрыторыі. Чым пазней — тым, адпаведна, менш.

**«Фонд стратегической культуры» (Расія)**

Прэзідэнт адзначыў, што ў краіне няма ніякага надзвычайнага становішча, аднак ураду, плануючы сваю палітыку, трэба сыходзіць з самага горшага варыянту. Між тым, напярэдадні Нацбанк заклікаў прыцягваць да адказнасці грамадзян, якія дэзінфармуюць людзей аб стане банкаўскай сістэмы. Атрымліваецца, што чыноўнікі павінны рыхтавацца да горшага варыянту развіцця сітуацыі, а народ павінен верыць у лепшае.

**«Deutche Welle» (Германія)**

У адным з апошніх інтэрв'ю, якое Бацька даў французскім журналістам, на пытанне, ці збіраецца Мінск і далей балансаваць паміж Масквой і Бруселем, той адказаў наступнае: «У Расіі буйны рэсурс энерганосьбітаў. У Еўрапейскага Саюза свой рэсурс — тэхналагічны». Вельмі паказальна, што нават Бацька адносна РФ проста канстатуе — «вялікая база сыравіны». Іншымі словамі, яго можна разумець прыкладна так: мы будзем вас даіць, а вы ведайце сваё месца. І пляваць на падвоеныя стандарты, калі мова ідзе пра інтарэсы маёй дзяржавы ў прызме сусветнага крызісу. «Усё ў хату» — вось прынцып кіравання Лукашэнкі.

**«Лимонка» (Расія)**

8 снежня мы будзем адзначаць дзевятую гадавіну стварэння дзіўнага дзяржаўнага фармавання — Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі. Гэта дзяржава не мае гербу, сцягу, прэзідэнта, ураду, сілавых і фіскальных ведамстваў, межаў і г. д. З самага пачатку гэта было палітычнае прыкрыццё перманентных і слаба матываваных датацыяў з боку Расіі ў падтрымку гаспадаркі Беларусі. Пік датацыяў быў у 2006-м — больш за сем мільярдаў. Тое, што ніякай Саюзнай дзяржавы няма, стала відавочна ў жніўні 2008-га, калі кіраўніцтва Беларусі адмовілася падтрымаць расійскую аперацыю ў Паўднёвай Асеціі... І ўсё б добра ў хітрамудрага таварыша Лукашэнкі, калі б не сусветны крызіс. Для мінімалізацыі яго наступстваў Лукашэнку патрэбны вольны рэсурс у 7–8 мільярдаў долараў ЗША.

**«Новый Регион» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГЕРМАНІЯ

Канстытуцыйны суд Германіі прызнаў супярэчнай Асноўнаму закону адмену кампенсацыі дарожных выдаткаў. Да студзеня мінулага года жыхарам прыгарадаў, якія працуюць у горадзе, цалкам кампенсавалі дарожных выдаткі, а пасля ім сталі вяртаць толькі выдаткі на першыя 20 кіламетраў шляху.

Суд абавязаў міністэрства фінансаў вярнуць грамадзянам 3 мільярда еўра, а таксама перайсці на старую сістэму. У цэлым бюджэт краіны недалічыцца 7,5 мільярда еўра. Іск у Канстытуцыйны суд падаў булачнік Хайн Хамбрэхт: яго сям'я з-за змены закона губляла па 470 еўра ў год. Зараз ён і яшчэ 20 мільёнаў немцаў атрымаюць кампенсацыі: урад абяцае выплаціць іх да сакавіка будучага года.

### ІРЛАНДЫЯ

«Мясны» скандал у Ірландыі з забруджанай дыяксінам свінінай, падобна, разрастаецца. Стала вядома, што небяспечнае для чалавека рэчыва выяўлена таксама і ў ірландскай ялавічыне. Дыяксін выяўлены на цэлым шэрагу жывёлагадоўчых фермаў. Урад Ірландыі, тым не менш, сцвярджае, што падстаў для хваляванняў няма.

Мяса з гандлю забірацца пакуль не будзе.

Так ці інакш, інфармацыя, якая з'явілася ў прэсе, можа адбіцца на экспарце ялавічыны з Ірландыі, як гэта ўжо адбылося ў выпадку са свінінай. Страты могуць скласці дзесяткі, калі не сотні мільёнаў еўра.

### ГРЭЦЫЯ

У Афінах у сераду пачаліся новыя сутыкненні паміж анархістамі і паліцыяй. Акрамя таго на ўсёй тэрыторыі Грэцыі прайшоў аднадзённы страйк.

На заклік уладаў перанесці страйк, прафсаюзы адказалі катэгарычнай адмовай. У Афінах і іншых буйных гарадах прайшлі маніфестацыі, арганізаваныя прафсаюзнымі аб'яднаннямі і левымі палітычнымі сіламі, да якіх далучыліся і анархісты.

Найбольш жорсткія сутыкненні адбыліся ля будынка парламента.

У розных гарадах краіны былі арыштаваныя больш за сорак чалавек па падазрэнні ў дачыненні да беспарадкаў апошніх дзён. Сярод іх — не толькі грамадзяне Грэцыі, але і замежнікі. Усё гэта адбываецца на фоне чакання вынікаў экспертызы, якая павінна адказаць на пытанне, ці страляў паліцыянт наўмысна на паразу, калі забіў 15-гадовага Гргараполуса, смерць якога стала падставай для пачатку сутыкненняў.

### ЧЭХІЯ

Прэм'ер-міністр Чэхіі Мірэк Тапаланек 7 снежня пераабраны лідэрам правячай Грамадзянска-дэмакратычнай партыі, паведамляе агенцтва «Франс Прэс». Пяцідзесяцідвухгадовы палітык атрымаў 284 галасы, у той час як яго сапернік, «еўраскептык» Павел Бем — 162.

Пасля паразы партыі на апошніх выбарах у сенат у кастрычніку М. Тапаланек заявіў, што гатовы пакінуць пасаду старшыні партыі, але хацеў бы застацца кіраўніком урада. Выбары аўтаматычна зацвердзілі палітыка таксама ў якасці кіраўніка ўрада ў наступным годзе, калі Чэхія будзе старшынстваваць у ЕС.

Варта зазначыць, што вярхоўны прадстаўнік Савета ЕС Хаўер Салана 5 снежня ўпершыню наведаў Прагу з афіцыйным візітам. Ён правёў шэраг сустрэч з кіраўніцтвам краіны і вядучымі палітыкамі. «Я ўпэўнены, што старшынства Чэхіі ў Еўрасаюзе будзе паспяховым, вы да яго вельмі добра падрыхтаваліся», — заявіў Х. Салана.

### ЕЎРАСАЮЗ

Самая высокая мінімальная заработная плата сярод 20 краін Еўрасаюза, дзе яна замацавана заканадаўча, устаноўлена ў Люксембургу, самая нізкая — у Балгарыі. Як паведамляе Еўрастат, мінімальная зарплата ў Люксембургу — 1 610 еўра, у Ірландыі — 1 462, у Нідэрландах — 1 357, у Бельгіі — 1 336, у Францыі — 1 321, у Вялікабрытаніі — 1 148 еўра.

За імі з адрывам ідуць Кіпр (789 еўра), Іспанія (700), Грэцыя (681), Мальта (612), Славенія (567), Партугалія (497), Польшча (344), Чэхія (329), Венгрыя (285), Эстонія (278), Славакія (267). У канцы спіса — Літва (232), Латвія (228), Румынія (137) і Балгарыя (112 еўра).

Для параўнання Еўрастат прывёў звесткі мінімальнай зарплаты ў ЗША (652 еўра) і краіне — кандыдаце ў сябры ЕС Турцыі (333 еўра).

Варта зазначыць, што ў Беларусі на заканадаўчым узроўні не замацавана паняцце мінімальнага ўзроўню зарплаты.

### ПОЛЬШЧА

Прадстаўнікі дзевяці краін Еўрасаюза ў польскім Гданьску не здолелі дамовіцца аб мерах барацьбы з глабальным пацяпленнем, каб зацвердзіць іх на саміце ЕС.

У рамках плана ЕС да 2020 года выкіды парніковых газаў павінны быць скарочаны на 20 працэнтаў у параўнанні з узроўнем 1990 года. Акрамя таго, прапануецца актывізаваць выкарыстанне альтэрнатыўных і аднаўляльных крыніц энергіі. Аднак прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі 6 снежня не змог пераканаць усходнееўрапейскія дзяржавы ў неабходнасці падтрымаць пагадненне аб скарачэнні выкідаў. Між тым, ён зазначыў, што бакі «паступова набліжаюцца да кампрамісу».

Польшча і Чэхія, напрыклад, не згаджаюцца з неабходнасцю рэзка скарацiць выкіды, паколькі такія меры ідуць уразрэз з нізкім узроўнем даходаў іх грамадзян і залежнасцю эканомікі ад вугалю.

Усходнееўрапейскія краіны настойваюць на бясплатных квотах на выкід парніковых газаў, у той час як, згодна з нормамі Бруселя, такія дазволы неабходны прадаваць на спецыяльных аўкцыёнах.

---

ПРЫЗНАЧЭННЕ

# ЛІБЕРАЛЬНЫ ВАРАГ

**Сенсацыя тыдня! Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў прызначыў на пасаду губернатара Кіраўскай вобласці Мікіту Белых — лідэра самай апазіцыйнай рэжыму партыі Саюз правых сіл (СПС). Што падштурхнула Мядзведзева на такі ўчынак? Прапануем агляд асноўных версій, якія абмяркоўваюцца на старонках расійская прэсы.**




### Версія 1 (афіцыйная)

Палітыка тут абсалютна не пры чым. Дзяржаве патрэбны прафесіяналы — адміністратары. Мікіта Белых сапраўдны ас. Ён быў віцэ-губернатарам ў Пермскай вобласці, потым, калі стаў старшынёй СПС, зарэкамендаваў сябе як добры менеджэр. Такія кадры, асабліва падчас крызісу, на дарозе не валяюцца. Гэтай версіі трымаецца і сам Белых. «Я буду працаваць губернатарам без палітыкі», — заявіў ён. Аднак у гэта верыцца з цяжкасцю. Дарэчы, некаторыя федэральныя апазіцыйныя грамадскія і палітычныя арганізацыі ўжо заявілі пра намер пераносу сваіх цэнтральных офісаў у Кіраў. Яны спадзяюцца, што як мінімум іх пакінуць у спакоі фіскальныя і адміністратыўныя органы, якія ўвесь час дастаюць іх у Маскве з усякімі праверкамі.

### Версія 2 (радыкальна апазіцыйная)

Яе аўтар Марыя Гайдар, адзін з лідэраў антыпуцінскай апазіцыі. Марыя лічыць, што пасада кіраўскага губернатара — крамлёўская кампенсацыя Белых за дапамогу ў развале СПС. Не так даўно большасць сяброў СПС прынялі рашэнне пра роспуск партыі і ўступленне ў сфармаваную пад патранажам Крамля партыю «Правое дело» (ПД). Белых адмовіўся блакавацца з ПД, аднак асабліва актыўнасці супраць ідэі ліквідацыі СПС, на думку Гайдар, таксама не дэманстраваў.

### Версія 3 (лімонаўская)

Эдуард Лімонаў, адзін з галоўных дысідэнтаў, лічыць, што Мядзведзеў за кошт прызначэння Белых хацеў раскалоць апазіцыйны рух. Ён, Белых і Каспараў фармавалі структуры руху «Солидарность», які яны бачылі як галоўны апазіцыйны форум краіны. Праўда, сам Белых ужо пасля прызначэння заявіў, што не прыпыніць працу ў гэтым праекце.

### Версія 4 (апартуністычная)

Новая пасада Белых, ранейшы дабраахвотны роспуск СПС і нараджэнне ПД ёсць не што іншае, як пошук кансенсусу паміж лібераламі і ўладай. Першыя зразумелі, што адкрытая канфрантацыя з рэжымам не прыносіць бонусаў. Другія не хацелі б маргіналізацыі ліберальнай апазіцыі. Гэта патрэбна і для паляпшэння іміджу цяперашняга расійскага рэжыму на Захадзе, а таксама і для таго, каб ужываць пры патрэбнасці ліберальныя рэцэпты, перш за ўсё ў гаспадарцы.

### Версія 5 (кадравая)

У адрозненні ад Лімонава, Гары Каспараў спакойна ўспрыняў ад'езд Белых у Кіраў. Шахматыст лічыць, што гісторыя з Белых сведчыць пра жудасны крызіс кадраў у дзяржаўным апараце. Яны гатовыя браць на працу нават апазіцыянераў.

### Версія 6 (моладзевая)

У дзяржаўных структурах ідзе натуральная змена пакаленняў. Прыходзяць новыя маладыя людзі, якія заступаюць на месцы старых чыноўнікаў. Белых цудоўна адпавядае стандартам прадстаўнікоў новай хвалі расійскай адміністрацыі.

### Версія 7 (рэгіянальная)

Мядзведзеў апошнім часам праводзіць хуткую змену рэгіянальных кіраўнікоў, каб мець лаяльную да сябе вертыкаль. Пры гэтым ён не прызначае людзей з пуцінскага рэзерву. Нават, як сведчыць выпадак з Белых, гатовы парушыць эксклюзіўную манаполію «мядзведзяў» на занянце губернатарскіх пасад. Наступнымі ахвярамі яго рэформы, дарэчы, называюць губернатараў Роселя (Екацярынбург), Громава (Маскоўская вобласць) і Лужкова (мэр Масквы).

### Версія 8 (прагрэсіўная)

Нягледзячы на крызіс у адносінах з Захадам у душы Мядзведзеў тайна сімпатызуе лібералам. Прызначэнне Белых — гэта знак таго, што ў прынцыпе прэзідэнт гатовы пайсці на дэмакратычныя рэформы. Ён толькі чакае зручнага моманту.

### Версія 9 (антыліберальная)

Улады з небяспекай назіраюць за ростам аўтарытэта Мікіты Белых у апазіцыйных колах. Каб не прыпыніць рост яго папулярнасці, у Крамлі вырашалі даць яму абсалютна бесперспектыўны з эканамічнага пункту гледжання рэгіён, дзе ён як губернатар абавязкова праваліцца, і такім чынам дыскрэдытуе дэмакратычную ідэю як мінімум гадоў на дзесяць.

### Версія 10 (раскрутка Белых)

Белых адправілі ў правінцыю з пэўнай місіяй — пазбавіць яго цяперашняга іміджу апазіцыянера, надаць яму лоск практыка і прафесіянала. У Крамлі маюць на яго сур'ёзныя планы. Як толькі яго кадэнцыя на пасадзе губернатара скончыцца, Мікіту паклічуць у Маскву і пачнуць штурхаць на больш сур'ёзныя пасады ва ўрадзе.

### Версія 11 (суперфантастычная)

Такое рашэнне, як прызначэнне заўзятага лiберала на пасаду губернатара, адназначна не магло быць прынята ў часы Пуціна. Магчыма, паміж Мядзведзевым і Пуціным ёсць супярэчнасці. Ці не ёсць Белых першай зарніцай выбарчай прэзідэнцкай кампаніі 2012 года? Пакуль галоўных кандыдатаў на пасаду лідэра Расіі двое — Пуцін і Мядзведзеў.

### Версія 12 (банальная)

Кіраўская вобласць абсалютна бесперспектыўны рэгіён. Ужо даўно ходзяць чуткі і размовы пра тое, каб увесці яе ў склад Пермскага краю. Хто лепш за ўсіх зможа тэхнічна гэта зрабіць, як не былы пермскі віцэ-губернатар у асобе Мікіты Белых?

**Даведка:**

Кіраўская вобласць — уральскі рэгіён Расеі. Насельніцтва — прыблізна 500 тысяч чалавек. Развітыя машынабудаванне (былая частка савецкага ВПК), сельская і лясная гаспадарка. Мясцовыя эліты не адзіныя. Цяпер функцыі губернатара выконвае Мікалай Шаклеін. Яго лічаць стаўленікам Сяргея Кірынка. Кірынка дабіўся абрання Шаклеіна, калі сам быў прадстаўніком прэзідэнта ў Волжскай акрузе. Тэрмін кадэнцыі Шаклеіна заканчваецца ў студзені. Паколькі вобласць у крызісе, адстаўка губернатара была відавочная. Яшчэ з верасня мясцовыя кланы пачалі прапаноўваць Маскве кандыдатаў на пасаду новага старшыні абласнога выканкаму. Аднак сталіца вырашыла прыслаць варага, прычым абсалютна нетыповага.

КАМЕНТАР

# МАНАРХІСТЫ-ГЛАБАЛІСТЫ

**Тых, хто апошнім часам збіраўся наведаць Паўднёва-Усходнюю Азію, чакаў непрыемны сюрпрыз: амаль усе авіякампаніі адмянілі рэйсы ў Бангкок — галоўны рэгіянальны перавалачны пункт для турыстаў. Прычына — захоп апазіцыяй міжнароднага аэрапорту ў сталіцы Тайланду. Пра тое, што адбываецца ў краіне, журналіст газеты «НЧ» размаўляе з Оліверам Ру, нямецкім журналістам, які працуе ў Індыі.**




***— Апазіцыя акупуе аэрапорты. Гэта ўсё, што беларускі абывацель ведае пра палітычны крызіс у Тайландзе. Хто акупуе, чаму акупуе і што патрабуе?***

— Аэрапорты захапілі актывісты апазіцыйнай партыі Народны альянс за дэмакратыю (PAD). Яны патрабавалі адстаўкі прэм'ера. У выніку акцыі прыблізна 350 тысяч замежных турыстаў не змаглі пакінуць краіну. Гэта моцны выклік эканоміцы краіны, вялікі артыкул даходаў якой — турызм. Пасля таго, як паліцыя не здолела вызваліць будынкі аэрапортаў ад пратэстуючых, улады пагадзіліся выканаць патрабаванні апазіцыі. Кіручая ў краіне Партыя народнай улады абвясціла пра самароспуск. Прэм'ер-міністр Самчай Вангсават падаў у адстаўку. Канстытуцыйны суд забараніў яму браць удзел у палітычным жыцці пяць гадоў.

***— У чым прычына пратэстаў?***

— Прэм'ер-міністр лічыўся чалавекам з клану Таксіна Чынавата. Таксін Чынават кіраваў краінай з 2001 па 2006 год. У жніўні 2006-га, калі ён быў за мяжой, у краіне адбыўся вайсковы пераварот. Аднак па сутнасці працэс адстаўкі Таксіна стартаваў у лютым таго ж года, калі ў краіне прайшлі масавыя маніфестацыі апазіцыі за яго адстаўку. Якраз тады і ўзнік Народны альянс за дэмакратыю — дзіўная кааліцыя грамадзянскіх актывістаў, прафсаюзаў і манархістаў.

***— Атрымліваецца дзіўная рэч: Чынавата скідаюць, аднак хутка яго прыхільнікі зноў вяртаюцца да ўлады.***

— Самчай быў абраны з падачы караля. Праблема ў тым, што Таксін мае шырокую базу сацыяльнай падтрымкі ў краіне і да гэтага часу, хай не наўпрост, але ўплывае на каралеўскую сям'ю. Гэта цудоўны папуліст, які мае імідж абаронцы інтарэсаў сялян. Ягоную былую палітыку можна апісаць як асцярожны кейнсіянізм, накіраваны на падтрымку малой сельскай гаспадаркі. Таму сяляне любяць яго. Дададзім, што падчас ягонага кіравання рэжымам татальна кантраляваліся ўсе галоўныя медыя. Таксін не дэмакрат. Доказ таму — забойства 84 дэманстрантаў у 2005 годзе. Сам Таксін, калі быў пры ўладзе, любіў, каб яго называлі галоўным босам фірмы «Тайланд». Гэта вялікі прагматык. Ён самы заможны тайскі бізнесмен. Дастаткова сказаць, што ў свой час ён нават хацеў набыць футбольны клуб «Манчэстэр Юнайтэд».



***— Працаўнікі прэм'ера выкарыстоўвалі жоўты колер, што вельмі нагадвала нядаўнія фруктовыя рэвалюцыі ў СНД. Ці можна лічыць рэвалюцыю ў Тайландзе «аранжавай»?***

— Натуральна, не. Жоўты колер — гэта каралеўскі колер. Выкарыстоўваючы яго, апазіцыя як бы чыніла сімвалічны ціск на манарха. Мы любім Вашу Вялікасць і хочам, каб ён прыслухаўся да нашай думкі — такое было галоўнае пасланне. Прырода PAD вельмі супярэчлівая. Пасля таго, як Таксіна знялі, PAD распусціўся. Цяпер ён адрадзіўся, аднак лідэры першага PAD сцвярджаюць, што гэта фальшыўка. Тут ёсць і левыя, і правыя. Напрыклад, лідэры партыі ўвогуле выступаюць супраць парламенцкай дэмакратыі, прапануючы, каб 70 працэнтаў парламенту абіраліся ад прафесійных карпарацый. І толькі 30 працэнтаў — у рамках нацыянальнага галасавання. Аднак апошнім часам у іміджы партыі прысутнічае вельмі моцны манархічны і нацыяналістычны складнік. Партыя, напрыклад, пратэставала супраць намераў ураду Камбоджы лічыць некаторыя будысцкія храмы помнікамі кхмерскай культуры. Аднак пры гэтым адзначым, што галоўная сацыяльная база партыі — сярэдні клас жыхароў Бангкоку.

***— Такія патрабаванні нармальна ўпісваюцца ў ідэалогію Таксіна?***

— Пры ўсім сваім нацыяналізме, PAD за больш адкрытую эканоміку. Таксіна падтрымлівалі буйныя карпарацыі, напрыклад Crown Property Bureau (CPB) — самы вялікі ўладальнік зямель у краіне, які не жадае прыватызацыі і прыходу іншаземных капіталістаў. Гэта, дарэчы, адпавядае афіцыйнай дактрыне манархіі — курс на самадастатковую гаспадарку. PAD фінансуюць фірмы, якія выступаюць за больш ліберальную мадэль. У прынцыпе мы назіраем раскол кіруючай эліты, калі гарадская, звязаная з замежным бізнесам буржуазія патрабуе свайго месца пад сонцам.

***— У чым, на вашу думку, перспектывы развіцця дэмакратыі ў краіне?***

— У акцыях грамадзян. Калі дзесяткі тысяч чалавек штурмуюць аэрапорт, патрабуючы адстаўкі карупцыйнага палітыка, гэта, безумоўна, яскравая праява прагрэсіўнай грамадзянскай пазіцыі. Пытанне ў тым, каб падчас немінучай будучай палярызацыі PAD знайшліся людзі, якія рабілі б акцэнт на барацьбе з карупцыяй, а не руху за добрага манарха.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### УЛАДЗІМІР ПУЦІН

Прэм'ер-міністр расійскага ўраду на мінулым тыдні ў прамой тэлефоннай лініі адказваў на пытанні расіян. Цяпер з'яўляецца ўсё больш фактаў, што гэта прамая лінія была інсцэніроўкай. Выпадковых пытанняў на адрас ВВП не паступала. Скандал пачаўся з таго, што напярэдадні прамой лініі мэр Ніжняга Ноўгараду абвясціў аб адкрыцці ў горадзе малочных кухняў. Праз некалькі гадзін гэта пытанне было ўзнята Пуціным. Адкуль мэр ведаў, што Пуцін будзе казаць менавіта пра гэтую праблему? Пазней на радыёстанцыю «Эхо Москвы» патэлефанавала адна жанчына і распавяла пра тое, як яна размаўляла з ВВП. Калі яна патэлефанавала, на тым канцы дроту спачатку спыталі, пра што будзе пытанне. Жанчына сказала, што будзе пытаць пра гастарбайтэраў. Тады ёй паведамілі, што крыху пазней ёй патэлефануюць. Праз некаторы час так і зрабілі. Прэм'ер даў сапраўды якасны адказ, праявіў добрыя веды ў гэтай галіне. Атрымліваецца, што Пуціна паспелі падрыхтаваць да пытання, а потым выбралі быццам выпадкова званок. Не менш дзіўная гісторыя адбылася з дзяўчынкай з Бурацiі, якая папрасіла ў дырэктара Кабміну сукенку. Праграма «Вести» надзвычай аператыўна зняла пра яе сюжэт. Быццам адразу пасля званку з Бурацыі туды паляцела здымачная група, прычым на ультрахуткасным самалёце.

### БАРАК АБАМА




Абранне Абамы выклікала эйфарыю не толькі сярод ягоных аднапартыйцаў. Феноменам Абамы вырашылі скарыстацца прыхільнікі стварэння ў ЗША левай сацыял-дэмакратычнай партыі, якая, на іх думку, зможа пахаваць двухпартыйную сістэму ў краіне. Нагадаем, што на цяперашні час усе сацыял-дэмакратычныя партыі Штатаў уваходзяць у склад дэмакратаў, дзе наіўна пераконваюць партыйнае ліберальнае кіраўніцтва трансфармаваць партыю ў нешта падобнае да французскіх сацыялістаў або нямецкіх эсдэкаў. Некаторым гэта надакучыла. Мова аб аўтарах маніфесту «Celebrate People's History and Build Popular Power Bloc» (Адсвяткуем народную перамогу — створым блок за ўладу народа). У тэксце маніфесту гаворыцца аб неабходнасці сабрацца 20 студзеня, у дзень інагурацыі Абамы ў Вашынгтоне, і заснаваць новую палітычную сілу. Амерыканскія левыя лічаць, што зараз для гэтага самы зручны час — шырокая народная мабілізацыя ў падтрымку Абамы на выбарах стварыла добрыя ўмовы для прапаганды марксізму. Самае цікавае, што 20 студзеня ў Вашынгтон збіраюцца антыглабалісты, для якіх што Абама, што Буш — аднаго поля ягады: імперыялісты і служкі капіталу. У выпадку беспарадкаў антыглабалісты, якія таксама называюць сябе левымі, здольныя сур'ёзным чынам папсаваць імідж новай партыі.

### МАЙКЛ СОМАРЭ



Прэм'ер краіны Папуа — Новая Гвінея не ведае, што рабіць з групай жанчын з вёсак рэгіёна Отака. Пачнём з таго, што тут ужо гадоў дваццаць цягнецца вайна паміж племяннымі кланамі. На днях у горадзе Гарока (сталіца правінцыі) цэнтральныя ўлады ў чарговы раз спрабавалі прывесці варожыя бакі за стол перамоваў. Перамовы цягнуліся беспаспяхова, пакуль слова не ўзяла жанчына, якая прадстаўляла жаночую грамаду адной з вёсак у эпіцэнтры канфлікту. Яна заявіла, што жанчыны яе вёскі не так даўно прынялі рашэнне: забіваць кожнае народжанае дзіця мужчынскага полу, каб прыпыніць пастаўку людскіх кадраў для вайсковых дзеянняў. Па яе словах, падобныя рашэнні прынялі жанчыны яшчэ трох вёсак. Некалькі немаўлят былі ўжо забітыя. Навіна выклікала сапраўдны шок у прысутных. Былыя праціўнікі, каб не дапусціць пашырэння практыкі забойстваў, адразу пагадзіліся на перамовы. Пытанне ў тым, што рабіць з тымі, хто забіваў сваіх дзяцей? З аднаго боку, гэта жорсткае забойства, з іншага — якраз злачынства прыпыніла вайну.

▸ ГАЛЕРЭЯ

# Я НАРАДЗІЎСЯ ТУТ…

На сайце (http://podzemka.org) стваральнікі галерэі пішуць пра сябе: «З самага пачатку свайго існавання ў 2004 годзе, галоўная мэта арт-галерэі — прэзентацыя сучаснага беларускага мастацтва маладых, сталых і вядомых аўтараў пры дапамозе персанальных і групавых выстаў, пленэраў, аўкцыёнаў, арт-кірмашоў і фэстаў, а таксама азнаямленне аматараў сучаснага мастацтва ва ўсім свеце з найноўшымі творамі беларускіх мастакоў.

Арт-галерэя «Падземка» працуе ў накірунках: «Жывапіс» (алей, акрыл, змешаная тэхніка на палатне), «Графіка» (працы на паперы), «Скульптура» (дрэва, бронза, граніт, мармур і інш.), «Фота» (аналагавае і лічбавае) і «Іншае» (кераміка, арт-аб'екты, малыя формы)».

Калісьці ў Мінску на вуліцы Маскоўскай быў цудоўны відэасалон, дзе можна было паглядзець і ўзяць на пракат кожны фільм з набору класічнага ці альтэрнатыўнага кіно. Калісьці на вуліцы Якуба Коласа была галерэя «Шостая лінія», слынная сваімі нестандартнымі праектамі. Іх даўно няма. Затое ёсць галерэя «Падземка», дзе ў наяўнасці і фільмы, і выставы. А яшчэ — інфармацыя і квіткі на большасць цікавых канцэртаў і спектакляў у горадзе. Сувеніры — ад віншавальных паштовак (зусім не плоска-трывіяльных, як паўсюдна), дробных сувеніраў, да тэнісак Уладзіміра Цэслера, карцін, скульптур і нават экзатычных кальянаў. А таксама кнігі і свежыя часопісы па культуры. З дырэктарам галерэі Валянцінай Кісялёвай і арт-дырэктарам Ганнай Чыстасердавай размову вядзе журналіст «НЧ» Аляксей Хадыка.

***Аляксей Хадыка: З чаго пачыналася «Падземка»? Як вы знайшлі памяшканне?***

**Валянціна Кісялёва:** Гэта быў падвал, спачатку тут месцілася крама адзення. Але вельмі хутка нам зрабілася сумна, нецікава, да таго ж асаблівага прыбытку крама не прыносіла… І калі мы пачалі выдумляць, чым бы нам дадаткова заняцца, раптам у статутных дакументах знайшлі радок — «творчая майстэрня». І зразумелі, што гэта месца ад пачатку творчае, створанае для рэалізацыі мастацкіх праектаў. Тады да галавы прыйшла ідэя — займацца рэалізацыяй сваіх крэатыўных жаданняў. Пачалі з экспанавання і продажу твораў дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, але мы вельмі хутка ператварыліся ў паўнавартасную невялікую галерэю.

***А.Х.: Што ж тут дзіўнага, яшчэ ў Галандыі XVII стагоддзя мастацкі працэс падштурхнула ўзнікненне самага сапраўднага, у першасным значэнні, рынку твораў мастацтва!***

**В.К.:** А мы не імкнёмся быць першаадкрывальнікамі: мы папросту робім тое, што нам цікава. Мы і не хочам на сябе цягнуць коўдру, што быццам робім нешта да нас невядомае.

***А.Х.: Часам ваша галерэя выклікае негатыўную рэакцыю суседзяў. Тры месяцы таму, калі ў суседнім Палацы мастацтваў (на вул. Казлова, 3) адчынілася Мінскае біенале, вы раптам «забралі» з яго некалькі твораў — Руслана Вашкевіча, Зоі Луцэвіч, Міхаіла Гуліна, Аляксея Лунёва — на «Тэрміновую выставу ў «Падземцы».***

**Ганна Чыстасердава:** А ніхто не забіраў, папросту гэтыя работы не былі прапушчаныя адборачнай камісіяй Біенале, а мы далі магчымасць мастакам іх паказаць.

**В.К.:** У нас няма накіраванасці — брацца нешта «андэграўнд-нае». Мы кіруемся прынцыпам — свабода творчасці мастака і магчымасць яго самавыяўлення праз выставу, асабліва калі яго самавыяўленне цікавае для нас. Плюс нас натхняе і тое, што незалежных галерэй мала, і мы, безумоўна, запатрабаваныя.

**Г.Ч.:** Пагадзіцеся, у Мінску часам немагчыма свабодна паказаць мастацтва любога накірунку — ад класічнага жывапісу да самага выразнага апошняга авангарду — адсутнічае неабходная інфраструктура.

**В.К.:** А наяўныя музеі і галерэі працуюць у старым ключы — існуе абавязковы выставачны план, які немагчыма пасунуць і арганізаваць які-небудзь нечаканы праект або паказ.

***А.Х.: Ці можна сказаць, што аптымізм адной з вашых прыхільніц, даследчыцы сучаснага мастацкага працэсу Вольгі Шпарагі, апраўданы: «адсутнасць камунікацыі мастак—грамадства, узніклай у 90-я гады, паступова пераадольваецца» (думка выказана 1 снежня на прэзентацыі кнігі «Постсоветская публичность: Беларусь, Украина», чарговага зборніка, выдадзенага ЕГУ)?***

**Г.Ч.:** Так, безумоўна, гэтыя сувязі зараз адбудоўваюцца; яны існуюць не толькі ў майстэрнях і на кухнях, і не толькі паміж самімі мастакамі. Пагадзіцеся, толькі за мінулы 2008 год адбылося два вялікіх біенале — у выставачных залах Нацыянальнай бібліятэкі і Палаца мастацтва, узнік рух, мастацкія конкурсы.

***А.Х.: Тады раскажыце пра свае праекты. Які ваш пасільны ўдзел у гэтым працэсе?***

**Г.Ч.:** Мы актыўна заняліся арганізацыяй выстаў два гады таму. Прычым сама выставачная зала была адасоблена ад памяшкання крамы толькі год таму.

**В.К.:** Яшчэ год таму мы не адчувалі сябе выразна выяўленай галерэйнай прасторай. Ды і зараз мы не зусім канчаткова сфармаваліся. У беларускіх умовах вельмі цяжка выжываць з прычыны высокай арэнднай платы, таму перайсці ў фазу выключна творчага праекта нам не ўдаецца. Застаецца спалучэнне крамы і галерэі, бо калі б мы нават пераключыліся выключна на творчую дзейнасць, арэндную плату нам не панізілі б. Мы — установа недзяржаўная, а такіх дзяржава не любіць. Мы і не звярталіся ў падатковыя органы з такой просьбай — з прычыны адчування, што лунае ў паветры, — нам падаецца, што нам адмовяць. А атрымліваць негатыў — апошняя справа.







***А.Х.: Вернемся да праектаў. Якія з іх, здзейсненых за год, вам найбольш аказаліся даспадобы? Можа, варта адзначыць і тое, што галерэя апошнія некалькі месяцаў занялася актыўнай адраснай рассылкай у інтэрнэце інфармацыі пра падзеі ў сучасным беларускім мастацтве. Прычым не толькі пра тыя, якія непасрэдна звязаны з «Падземкай».***

**Г.Ч.:** З дапамогай нашых сяброў мы імкнёмся анансаваць праз рассылку цікавыя навіны, тое, што адбываецца ў галерэі, у Беларусі, і нават за межамі краіны. Сучаснае мастацтва і мастацкі працэс — гэта не толькі выставачная прастора — гэта і вуліцы, плошчы, адпаведныя газеты і часопісы з крытычнымі артыкуламі і дыскусіямі, якіх таксама не стае. Артыкулы друкуюцца не заўсёды, калі хочацца. Важным з'яўляецца ўласна сам інтэрнэт са спецыялізаванымі парталамі. Што тычыцца нашых праектаў…

**В.К.:** Я мяркую, добрых праектаў у нас у гэтым годзе было некалькі. Першы, які адбыўся ў пачатку 2008 года, — «бярозавы праект» Франца Родвальта з Германіі. Потым экспанаваліся фатаграфіі француханкі Мацільды Жыль — інтэрактыўны праект: на адрас галерэі можна было выслаць свае разважанні або ўражанні, якія пазней мастачка выкарыстае ў сваёй творчасці. Фактычна «выстава на вынас» — гледачы на абмен да сваіх будучых каментараў маглі ўзяць адзін з фотадымкаў з сабой. Добра выставілася плакацістка Людміла Кальмаева. І вельмі забаўны, з вясёлай правакацыяй, быў фотапраект Юліі Лейдзік: звычайныя жанчыны паказаны на фотаздымках з іх улюбёнымі мадэлямі-правобразамі са свету гламурнай поп-культуры. Мне асабіста вельмі спадабалася выстава Міхаіла Гуліна і Васіля Пачыцкага. У гэтым праекце ў прастору галерэі былі перанесены шэсць эпізодаў, інсцэніраваныя і зафіксаваныя ў розных раёнах горада — такім чынам гарадское асяроддзе эстэтызавалася і пераносілася ў выставачны інтэр'ер.

**Г.Ч.:** Выявілася, што з выкарыстаннем нестандартнага погляду на штодзённае можна дасягаць выдатнага эстэтычнага эфекту. Нарэшце, нестандартны канцэптуальны відэапраект паказала Вольга Сазыкіна. Яна мастак па шклу, але таксама выдатны майстар перформансаў, калісьці пачынала свае прэзентацыі яшчэ ў галерэі «Шостая лінія» на Якуба Коласа. На жаль, зараз у Беларусі яна не часта прадстаўляе свае ідэі, больш працуе за мяжой. І вельмі рэдка — у дзяржаўных установах.

***А.Х.: Якраз пытанне наконт «афіцыйнай прасторы» — ці часта вас запрашаюць на музейныя дыскусіі ці на дзяржаўнае ТБ?***

**В.К.:** Так, неяк запрашалі на культурнае ток-шоу на канале «Лад», але мне не спадабалася дыскусія на гэтым дзяржаўным канале — яна падалася папросту нецікавай. Да таго, мне наша ТБ наогул падаецца малазмястоўным — хто яго глядзіць з тых людзей, сапраўды зацікаўленых культурай?

**Г.Ч.:** Больш эфектыўным падаецца выкарыстанне інтэрнэту — тыя людзі, якія нам зараз дапамагаюць з гэтым накірункам, самі прыйшлі да нас, яны былі сапраўды зацікаўленыя, і кола падзей, якія мы зараз асвятляем праз рассылку і сайт, — даволі шырокае. А на дзяржаўных сайтах і ў медыя змястоўным і цікавым праектам дастатковая ўвага надаецца не заўсёды. Да таго ж, мы займаемся і прэзентацыяй кніг і фільмаў. Можна сказаць, мы свядома ўзялі на сябе ролю «медыума» паміж гледачамі і творцамі. Калі да нас звяртаюцца нашы сябры — тэатралы, мастакі, рэжысёры, з просьбай — «у вас багата наведвальнікаў, дапамажыце» — мы дапамагаем. І абвесткамі, і выставамі, і інфармацыяй на сайце, якія, як вы заўважылі, апошнім часам зрабіўся тэматычна структураваным на адпаведныя старонкі.

***А.Х.: Апошняе пытанне: як вы прыйшлі ў шэрагі экспазіцыянераў?***

**В.К.:** Як мы перайшлі ў шэрагі галерэйшчыкаў нават цяжка сказаць: ці тое быў выпадак, ці заканамернасць… Шмат што ў жыцці здараецца як спантанная з'ява — і гэта таксама, дакладна вам скажу, не было запланавана.

Не было такога плану — «я буду займацца галерэяй» — хутчэй галерэя занялася мной і нашым калектывам… А прафесійна? Нарадзіўся чалавек і нарадзіўся… Што сказаць пра сябе — нарадзіліся мы тут. І мы тут.

КОНКУРС

# ПАТРЫЁТЫ ПАЭЗІІ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

Пра абвешчаную ў Гданьску міжнародную літаратурную прэмію ў Беларусі чулі хіба тое, што на яе быў намінаваны зборнік вершаў Уладзіміра Арлова «Паром праз Ла-Манш». Між тым, грандыёзны праект гданьскай мэрыі заслугоўвае нашай увагі сам па сабе. Перад намі — культурная ініцыятыва новага тыпу. У Еўропе заўважная агульная тэндэнцыя: імпрэзы, пакліканыя прапагандаваць высокую культуру, з кожным годам робяцца ўсё больш арыгінальнымі, відовішчнымі і здольнымі заінтрыгаваць. Што ж, у эпоху нечытання ўвагу аўдыторыі могуць прыцягнуць толькі такія.

Польскі перакладчык Адам Паморскі непасрэдна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы паэтычных урачыстасцяў, запланаваных у Гданьску на сакавік 2010 года: працуе над перакладам кнігі "Паром праз Ла-Менш" на польскую мову. Падчас нядаўняга прыезду ў Мінск Паморскі, на жаль, не змог прэзэнтаваць ужо зробленыя пераклады беларускай публіцы напару з Уладзімірам Арловым — замест гэтага перакладчык наведаў аўтара ў рэабілітацыйным цэнтры "Аксакаўшчына". Нягледзячы на напружаны графік, спадар Паморскі ласкава пагадзіўся дапамагчы нам з аналізам паэтыкі конкурса "Еўрапейскі паэт свабоды" і яго палітыкі.


Фота Глеба Лабадзенкі

***— У чым сутнасць конкурсу «Еўрапейскі паэт свабоды» і якія яго задачы?***

— Гэты конкурс — літаратурная прэмія, якую заснаваў горад Гданьск. Яго асноўная ідэя — стварэнне магчымасці свабоднага абмену ідэямі, поглядамі, паэтыкамі. Паводле сістэмы падбору ўдзельнікаў гэты конкурс выразна *еўрапейскі*. Ён прапагандуе ідэю агульнаеўрапейскай літаратуры з яе магутным духам *свабоды*. Нядзіўна, што ідэя такога мерапрыемства паўстала менавіта ў Гданьску — горадзе міжэтнічным з самага пачатку свайго існавання, горадзе шматнацыянальным, горадзе, які спрадвеку стаіць на перакрыжаванні гандлёвых шляхоў Еўропы. Структура конкурсу даволі складаная. Увесь «цыкл» займае больш за два гады. У першай палове 2008 года лёсаваннем з дапамогай кампутара было вызначана сем краін-удзельніц. Гэта Беларусь, Кіпр, Сербія, Славакія, Славенія, Францыя, Швецыя. Потым у кожнай краіне былі вызначаны паэтычныя зборнік, які адпавядае тэме конкурсу. Наватарствам з'яўляецца тое, што кніжкі ўсіх, хто прэтэндуе на прэмію, па-польску ніколі не існавалі. Яны перакладаюцца спецыяльна для конкурсу. Польскаму журы цяжка было б параўноўваць творы на сямі розных мовах, такім чынам, шмат што будзе залежаць ад перакладчыка. У сакавіку 2010 года журы з сямі чалавек назаве пераможцу, які атрымае 100 тысяч злотых. Але, незалежна ад імені шчаслівчыка, гэта бяспройгрышная латарэя. Нават калі прэтэндэнт не атрымае галоўнай узнагароды, падарункам стане зборнік вершаў, выдадзены добрым польскім выдавецтвам, які будзе выдатна разрэкламаваны і знойдзе свайго чытача. Сваімі вершамі *паэт* прадставіць палякам сябе і сваю краіну. Гэта вельмі важна.

***— Чаму паэзія, а не проза? Здавалася б, ідэі свабоды і еўрапейскай інтэграцыі прасцей выславіць у жанры рамана. Да таго ж паэзія зараз не запатрабаваная на кніжным рынку.***

— У мяне два адказы. Па-першае, сярод кіраўнікоў Гданьска — некалькі паэтаў майго пакалення. Арганізатары — патрыёты паэзіі, так што гэта атрымалася само сабой. У гэтым конкурсе адчуваюцца атмасфера і традыцыі міжнародных паэтычных фестываляў. Па-другое, міжнародных паэтычных прэмій у Польшчы пакуль не было. Прэмія Гданьска стане галоўнай польскай узнагародай такога плану. Найбліжэйшая ёй па духу — вроцлаўская прэмія «Ангелус». Яе прысуджаюць кнізе прозы, выдадзенай па-польску цягам папярэдняга года. Старшыня міжнароднага журы — перакладчыца Наталія Гарбанеўская, руская паэтка-праваабаронца, грамадзянка Польшчы.

***— Дарэчы, пра суддзяў. Журы прэміі Гданьска — сем польскіх дзеячаў культуры рознага веку, эстэтычнай накіраванасці, так ці інакш звязаных з гэтым горадам. Гэта рэжысёр Агнешка Холанд, актор і рэжысёр Анджэй Сэвэрын, гісторык і філосаф Кшыштаф Помян, літаратуразнаўца Станіслаў Росек, культавы пісьменнік сярэдняга пакалення Павал Гюле, скандальная пісьменніца маладога пакалення Дарота Маслоўска і старшыня журы — паэт старэйшага пакалення, выдавец Рышард Крыніцкі. Ці зможа такое разнастайнае таварыства прыйсці да ўзважанага рашэння?***

— Паглядзім, якому кандыдату яны прысудзяць прэмію. Калі нашаму — значыць, гэта было вартае журы (смяецца).

***— Калі б выбар залежаў не ад сляпога лёсавання з дапамогай кампутара, а ад жывых людзей, ці трапіла б Беларусь у спіс краін-удзельніц конкурсу?***

— Наколькі я разумею, падчас лёсавання Еўропа была падзеленая на некалькі рэгіёнаў, і кампутар выбіраў па пэўнай колькасці краін з кожнага. Ці трапіла б Беларусь — невядома, але ідэя была ў тым, каб усе еўрапейскія краіны ўдзельнічалі на роўных, без падзелу на Старую ці Новую Еўропу, незалежна ад мяжы Еўрасаюза. Такім чынам, Беларусь у гэтым конкурсе проста прадстаўляе пэўную геаграфічную частку Еўропы. Гэтак жа Паўночную Еўропу прадстаўляе Швецыя, Балканы — Сербія і так далей.

***— Якое дачыненне вы маеце да конкурсу «Еўрапейскі паэт свабоды»?***

— Я адзін з сямі польскіх перакладчыкаў, да якіх арганізатары конкурсу звярнуліся як да экспертаў. Кожны эксперт мусіў прапанаваць сваю кандыдатуру, а пасля падрыхтаваць польскае выданне зборніка вершаў абранага паэта. Да мяне звярнуліся як да перакладчыка беларускай паэзіі. Таксама я меў права высоўваць кандыдатуры польскіх паэтаў. Паміж імі адбудзецца асобны конкурс, і адзін з сямі паэтаў далучыцца да «сямі фіванскіх герояў» з розных бакоў Еўропы, каб прадставіць на конкурсе ў Гданьску Польшчу.

***— Такім чынам, Беларусь на конкурсе прадстаўляе зборнік вершаў Уладзіміра Арлова «Паром праз Ла-Манш». Чаму вы абралі гэтага паэта і гэту кнігу?***

— Забыўся згадаць яшчэ адну «нумералагічную» ўмову конкурсу: спаборнічаюць паэтычныя зборнікі, выдадзеныя ў 2005 ці 2006 годзе. Я звярнуўся па параду да майго беларускага калегі Лявона Баршчэўскага і пераліччыў яму патрабаванні да будучага кандыдата. Той адразу назваў кнігу «Паром праз Ла-Манш» Уладзіміра Арлова. Прачытаўшы яе, я пагадзіўся, што прэтэндэнт ад Беларусі знойдзены. У рэкамендацыі, якую я напісаў для Гданьска, я падкрэсліў: калі чытаеш гэтыя вершы Арлова, ты бачыш унутраны досвед чалавека абсалютна свабоднага. Няма лішніх разважаў пра свабоду, бо гэты чалавек свабодны сам — у духоўным, інтэлектуальным плане. Вера, скептыцызм, жыццёвыяназіранні і грамадзянская пазіцыя паэта гарманічна спалучаюцца ў яго лірыцы. Гэта больш каштоўна, чым рыторыка ці публіцыстыка. Стаўленне Арлова да гісторыі, да беларускай, еўрапейскай і сусветнай культуры нагэтульki глыбокае, што кніга заклікае падумаць пра сутнасць свабоды выбару, а не пра барацьбу за прапісныя ісціны.

***— Ці плануюцца «рэкламныя туры» «еўрапейскіх паэтаў свабоды»?***

— Наколькі я ведаю канкрэтнасць гданьскага мыслення, без гэтага не абыдзецца. Кожны прэтэндэнт абавязкова будзе мець аўтарскія сустрэчы ў Гданьску і, магчыма, у іншых гарадах Польшчы.

***— У 2016 годзе адзін з гарадоў Польшчы павінен атрымаць ганаровы і вельмі прэстыжны статус еўрапейскай сталіцы культуры. Ці не з'яўляецца дадзеная прэмія адным з мерапрыемстваў, пакліканых пераканаць, што такі статус павінен атрымаць менавіта Гданьск?***

— Не ведаю, ці маюць гарадскія ўлады перад сабой такую мэту. У любым выпадку, задачы конкурсу значна больш маштабныя. Але тое, што прэмія «Еўрапейскі паэт свабоды» — арыгінальная і унікальная — гэта факт.

***— Што дасць правядзенне такой прэміі Гданьску, Польшчы, і што яно дасць Еўропе?***

— Гданьску абвяшчэнне і правядзенне такой саліднай у фінансавым плане і грандыёзнай па размаху прэміі дае несумненны міжнародны прэстыж. Каштоўная сама ідэя конкурсу «Еўрапейскі паэт свабоды» — яна абсалютна адпавядае духу і традыцыям Еўразвязу. Што да Польшчы — гэта прэмія ўжо стаіць у шэрагу новых прэстыжных літаратурных узнагарод, створаных літаральна ў апошнія тры-чатыры гады. Прагназуецца, што агулам такіх прэмій будзе каля васьмі. Гэта прэміі «Ангелус» і «Сілезіюс» ва Вроцлаве, гэта прэмія «Gazety Wyborczej» «Ніка», прэмія Польскага Радыё і Тэлебачання «Когіта» і літаратурныя прэміі гораду Гдыні за паэзію, прозу, эсэістыку... Спецыфіка Гданьскай прэміі — у міжнародным характары. «Ангелус» уручаецца літаратарам з Сярэдняй Еўропы, прэмія Гданьска — агульнаеўрапейская. З гледзішча Еўропы — гэта адна з першых такіх узнагарод у посткамуністычным свеце. Важна, што яна аб'ядноўвае ўсю Еўропу — без падзелаў на Усход і Захад.

***— Які верш з кнігі «Паром праз Ла-Манш» блізкі вам як перакладчыку?***

— Цяжка сказаць. Кніга чытаецца цалкам — гэта не паасобныя творы. Мне вельмі блізкі верш «Нявеста паўстанскага камісара», які мы з Валодзем чыталі дзвюма мовамі на прэзентацыі анталогіі беларускай паэзіі «Не хіліў галаву перад сілай» падчас турнэ па гарадах Польшчы. Мяне ўражвае гістарычны скептыцызм гэтага верша, яго гістарычнае вымярэнне: барацьба за свабоду драматычным чынам супрацьпастаўленая тут асабістаму лёсу герояў. Тут няма відавочных ісцін, гэта твор чалавека, які разумее, што такія ісціны з'яўляюцца пасля як нацыянальная легенда, а ў сапраўдным жыцці ўсё значна складаней.

***— Разам з вамі будзем чакаць вынікаў конкурсу «Еўрапейскі паэт свабоды». Дарэчы, па сакрэце, якія шанцы на перамогу ў беларускага кандыдата?***

— Загадваць рана, але яны, безумоўна, ёсць. Незалежна ад меркавання журы, улады Гданьска з асаблівай радасцю прывітаюць Уладзіміра Арлова: многія з кіраўнікоў гораду — палякі, чые сем'і пераехалі ў Гданьск пасля вайны з Заходняй Беларусі.

**З кнігі Уладзіміра Арлова «Праліў праз Ла-Манш» (Мінск: «Логвінаў», 2006).**

Нявеста паўстанскага камісара

*Ён будзе любіць яе*
*да дзьмухаўцовай бязважкасці...*
*У іх народзяцца*
*дзве белагаловыя дзяўчынкі,*
*і яго ўзнагародзяць*
*ордэнам святога Станіслава...*

*Яна ратавала яго,*
*параненага расейскаю куляй,*
*і, шчыплючы корпію,*
*атручвала сваю кроў*
*нянавісцю*
*да нейкага Каліноўскага*
*з яго газеткай,*
*друкаванай для тых самых*
*мужыкоў,*
*што выдавалі інсургентаў,*
*атрымліваючы*
*па пяць царскіх рублёў*
*за жывога*
*і па тры — за мёртвага.*
*Аднойчы ўранні*
*ён папрасіў*
*суніцаў з вяршкамі*
*і памёр,*
*вінавата адвёўшы позірк.*
*На таемным пахаванні*
*яна назаўсёды пракляла*
*гэтую зямлю,*
*непатрэбны ёй*
*вецер свабоды*
*і яе мову,*
*якая пахне*
*арыштамі і кроўю.*
*Абдымаючы іншых,*
*яна ўсё жыццё ўспаміналa*
*ягоную радзімку*
*ў патайным месцы*
*і малілася,*
*каб Бог пакараў тых,*
*хто,*
*страляючы ў маскалёў,*
*збіваў яблыкі*
*яе залатых мрояў.*

*Ягоныя біёграфы напішуць:*
*да апошняга ўдару сэрца*
*яна заставалася*
*палымянаю патрыёткай.*

▶ МУЗЫКА

# «Аляксандра і Канстанцін»: ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ ТВОРЧАСЦІ І ЎЗАЕМНАГА КАХАННЯ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Здаецца, зусім нядаўна беларускія слухачы ўпершыню звярнулі ўвагу на цікавы музычны дуэт барысаўчан — спявачкі Аляксандры Кірсанавай і гітарыста Канстанціна Драпезы, якія дэбютавалі на Беларускім тэлебачанні з вельмі запамінальнай і арыгінальнай песняй «Арэхава чаша». З таго часу дуэт «Аляксандра і Канстанцін» стаў сапраўднай зоркай айчыннай папулярнай музыкі, а таксама прыгожай сямейнай парай. Не верыцца, але з таго часу ўжо прамільгнула дзесяць гадоў...**



Photo.ByMedia.Net



Фота аўтара

У творчым жыцці знакамітага дуэту «Аляксандра і Канстанцін» былі не толькі творчыя перамогі, але і расчараванні. Успомнім для прыкладу выступ дуэту на «Еўрабачанні–2004», калі беларускія артысты ўпершыню прадставілі айчынную папулярную музыку на гэтым мегафоруме. Той дэбют быў для артыстаў далёка не безвыніковым: нягледзячы на тое, што музыкі не выйшлі ў фінал конкурсу «Еўрабачанне–2004», дуэт атрымаў станоўчыя водгукі ў фэставай прэсе, шмат запрашэнняў на іншыя еўрапейскія фэсты, новыя творчыя кантракты. Але ў сябе на радзіме адразу з'явіліся беспадстаўныя сумненні ў правамернасці выбару дуэта «Аляксандра і Канстанцін» для «Еўрабачання–2004». Шмат эмоцый і трывог выклікаў у тых, хто сочыць за творчасцю знакамітых артыстаў, нядаўні факт звальнення «Аляксандры і Канстанціна» з аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга...

Але артысты не скарыліся пакручастым віражам свайго лёсу і ўвесь час знаходзяцца ў творчым пошуку: запісваюць новыя песні, выдаюць альбомы, здымаюць відэакліпы, удзельнічаюць у тэлешоў, арганізоўваюць «жывыя» канцэрты ў прэстыжных залах рэспублікі. Вось і на мінулым тыдні ў прыхільнікаў творчасці дуэта «Аляксандра і Канстанцін» была нагода ўпэўніцца ў добрай творчай форме выканаўцаў. Па іх ініцыятыве ў сталічным клубе BRONX адбыўся дабрачынны канцэрт «Каханне супраць СНІДу», які быў прымеркаваны да Сусветнага дня змагання супраць гэтага смяротнага захворвання. Гэты канцэрт быў таксама прысвечаны і дзесяцігадоваму юбілею дуэта «Аляксандра і Канстанцін». Таму на сустрэчу з любімымі выканаўцамі прыйшлі не толькі слухачы, але і сябры Аляксандры і Канстанціна — выдатныя беларускія спартсмены, у тым ліку ўладальнікі залатых медалёў алімпіяды ў Пекіне па вяслярству на каноэ браты Аляксандр і Андрэй Багдановічы, сябры-музыканты, а таксама тэлебачанне, прадстаўнікі якога з тэлеканала СТВ здымалі гэты канцэрт для далейшай яго трансляцыі.

Ну а галоўныя дзеючыя асобы канцэрта — музыкі дуэта «Аляксандра і Канстанцін» — у адкрытай манеры дыялога са сваімі прыхільнікамі шчыра заклікалі да вернасці ў каханні, нагадвалі лепшыя кампазіцыі са сваіх альбомаў розных гадоў. Мо таму так настальгічна прагучала песня з дэбютнага альбому дуэта «За ліхімі за марозамі», а таксама пазнейшыя творы — «А дзе была вуціца» і «Юр'я», «Явар», «Пчолка» і іншыя песні. Былі і іншамоўныя спевы на тэму кахання, такія, як «My Galileo», «The Money & The Mountains», пад якія добра таньчылася тым, хто прыйшоў у клуб па адпачынак.

Адным з сюрпрызаў канцэрта стала з'яўленне на сцэне сябра дуэта — спявака, уладальніка Гран-пры «Славянскага базара–2004» Пятра Ялфімава. Разам з Алесяй Кірсанавай Пётр артыстычна выканаў беларускую народную песню «А ў полі вярба», а завяршыў свой выступ П. Ялфімаў акапэльным спевам кампазіцыі Ю. Семяннякі і М. Шушкевіча «Ты мне вясною прыснілася» з рэпертуару «Песняроў». Спявак даказаў, што песні на роднай мове яму не чужыя, а тое, што ў асноўным гучыць у яго выкананні на тэлебачанні і радыё, — толькі даніна моўнаабмежаванаму «фармату» тутэйшых электронных сродкаў інфармацыі.

Цудоўным завяршэннем канцэрта ў клубе BRONX стаў выход на сцэну для сумесных спеваў лідэра гурта «Палац» харызматычнага Алега Хаменкі. Яго сольная песня «Кола грукатала» была ўспрынята слухачамі як сігнал да агульных спеваў, авацый і ўмацавання пазітыўнага настрою. Ну а сумесныя музычныя нумары дуэта «Аляксандра і Канстанцін» і Алега Хаменкі нагадалі ўсім прысутным пра хуткія і доўгачаканыя святы. Пад авацыі, што не сціхалі, агульным намаганнямі была выканана адпаведная песня — «Каляда-калядзіца», у якой вельмі далікатна зайграла на драўлянай флейце і акарыне Алеся, а Канстанцін яшчэ раз прадэманстраваў свой прафесіяналізм як цудоўнага гітарыста. Працягам святочнай тэмы і развітальнай стала песня, якая стала своеасаблівым сімвалам беларускіх Калядаў — «Святы вечар».

Канцэрт дуэта «Аляксандра і Канстанцін» у клубе BRONX яшчэ раз нагадаў, што сапраўднае каханне, сужэнская вернасць і ўзаемная павага — лепшы сродак у барацьбе са СНІДам. Гэта гарантыя не толькі здароўя ўсёй сям'і, але і творчага даўгалецця артыстаў.

▶ МУЗЫКА

# РЭПРЭСАВАНАЕ МАСТАЦТВА

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

**15 снежня ў памяшканні Інстытута мастацтвазнаўства этнаграфіі і фальклору НАН адкрываецца вернісаж твораў заходнебеларускіх мастакоў.**

Інакш як «першай, доўгачаканай ластаўкай» выставу, што падрыхтавалі мастакі суполкі «Пагоня», не вызначыш. У экспазіцыю ўключаны невядомыя шырокаму гледачу творы жывапісу і графікі класікаў беларускага нацыянальнага мастацтва — П. Сергіевіча, М. Сеўрука, Я. Драздовіча. Адначасова наведвальнікі змогуць адкрыць для сябе мала знаных беларускіх мастакоў — С. Вішнеўскага, Зм. Крачкоўскага, пабачыць творы жывапісца Паўла Южыка і графіка Васіля Сідаровіча.

Дарэчы, знаёмствам з лёсамі і творчасцю гэтых мастакоў могуць пахваліцца лічаныя прафесіяналы-мастацтвазнаўцы. Не па сваёй віне. Проста імёны і творчая спадчына цэлай плеяды выбітных беларускіх мастакоў былі на дзесяцігоддзі рэпрэсаваны і штучна выкраслены з ужытку і памяці.

Выстава прадстаўнікоў віленскай мастацкай школы, зладжаная на грунце твораў з прыватных калекцыяў, пераканаўча сведчыць, што ва ўсе часы ў Беларусі не пераводзіліся людзі, для якіх заўжды існавалі сапраўдныя каштоўнасці. Па-за «крышталём і дыванамі».

Першы публічны крок у спасціжэнні блізкай нам нацыянальнай спадчыны, дзякуй Богу, зроблены. Але крок гэты абавязвае.

▶ ПАДЗЯКА

Ад усяго сэрца перадаю падзяку медыкам, а таксама ўсім сябрам, знаёмым і незнаёмым людзям, калегам-літаратарам, журналістам, палітыкам і дыпламатам, якія падтрымалі мяне пасля аперацыі на сэрцы сваімі тэлефанаваннямі, эсэмэскамі, тэлеграмамі, лістамі і наведваннямі.

**Уладзімір Арлоў**

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12. 09. 2008.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
chasnavinau@gmail.com; http://kamunikat.org/novy_chas.html

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 12.12.2008. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.